Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 САКАВІКА 2015 г. АЎТОРАК № 50 (27908) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Старасвецкая мода Янкі Купалы**

СТАР. 4



**Як аўтарамонтнік з Брэста зоркай стаў**

СТАР. 8



**Дзеля кахання. Рэальная гісторыя**

СТАР. 9

## ЯЕ СВЕТЛАСЦЬ ПЯШЧОТА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ШОРАЦ, старшыня Мінгарвыканкама**

*«Сёння ў Мінску рэалізуецца некалькі тысяч інвестыцыйных праектаў, большасць з якіх — у будаўнічай сферы. Значны аб'ём інвестыцый прыцягваецца ў фінансавы сектар, аперацыі з нерухомасцю, гандаль, сферу паслуг. Інвестары ўкладваюць сродкі ў самыя розныя сферы, але пераважна ў сталіцы будуюцца новыя дзелавыя, гандлёва-забаўляльныя і лагістычныя цэнтры, магазіны, аб'екты грамадскага харчавання. Адзін з самых буйных інвестыцыйных праектаў, які зараз рэалізуецца, — будаўніцтва шматфункцыянальнага цэнтра «Мінск-Мір». Гэта будзе сучасны дзелавы і фінансавы цэнтр сталіцы з развітой інфраструктурай. Рэалізацыя праекта дасць магчымасць стварыць у Беларусі пляцоўку для вядзення бізнесу па прыкладзе іншых буйных фінансавых цэнтраў Еўропы і Азіі, а таксама будзе спрыяць развіццю ўнутранага фінансавага рынку і спадарожных перадавых паслуг».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.03.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15120,00 | ▲ |
| Еўра | 15900,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 244,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 694,90 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Круглы стол

## ЦАНА ЗДАРОЎЯ

### Лепш добрыя звычкі, чым добрыя лекі

**Усё яшчэ думаеце, што здаровы лад жыцця, прафілактыка захворванняў — забавы для багатых? Ды гэта проста вашы адгаворкі і лянота! Фітнес-цэнтры і замежныя прадукты тут ні пры чым. Проста прыгадайце, колькі сёння каштуе лячэнне нават самага простага захворвання. Дый не абавязкова ўсім рваца на тэнісны корт, асабліва калі не вядома, ці падыходзіць вам такая фізічная нагрузка. Можа быць, сёння і прасцей, і даступней насмажыць каструлю катлет, але ж аднойчы ўсё роўна давядзецца заплаціць за іх трайны кошт. Катлеты, вядома, не атрута, але штодня ды без гародніны ўжываць іх небяспечна.**

**Давайце сёння разбяромся з самымі простымі рэчамі на шляху да здаровага ладу жыцця. Самае элементарнае — гэта харчаванне, фізічная нагрузка і наша свядомасць, якая дапаможа ўкараніцца новым карысным звычкам.**

**Разважаць на гэту тэму будуць галоўны тэрапеўт Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Вольга МАРШАЛКА, галоўны ўрач-дыетолаг камбіната харчавання «Вітамін» Марына ПАПОВА, урач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Уладзіслаў ІВАНОЎСКІ, загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Кірыл РАМАНАЎ, урач-рэфлексатэрапеўт аддзялення традыцыйнай кітайскай медыцыны Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Таццяна АБРАМАВА.**

СТАР. 10-11

■ Надвор'е

## Тыдзень веснавога сонца

### Аднак у нядзелю падмарозіць нават удзень

**У аўторак на тэрыторыю нашай краіны завітае велізарны і малярухомы антыцыклон, які будзе фарміраваць умовы надвор'я ў нас на працягу амаль усяго тыдня, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму сёння ўдзень чакаецца малавоблачнае надвор'е без ападкаў. Максімальная тэмпература паветра складзе ад 8 да 13 цяпла. І надалей — з серады да пятніцы — таксама чакаецца сонца і без дажджоў. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 0 да 5 марозу, а месцамі падмарозіць і да мінус 7 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да плюс 6-13 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, менавіта на выхадныя надвор'е пачне псавацца. Ужо ў суботу атмасферны фронт з боку поўначы Еўропы прынясе да нас месцамі кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу (раніцай). Уначы на суботу тэмпературны фон будзе вагацца ад мінус 7 да плюс 2 градусаў. Пахаладае і ўдзень, калі чакаецца ад 2 цяпла на поўначы краіны да плюс 13 градусаў па поўдні. У нядзелю ўначы месцамі, а ўдзень па паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі (дождж і мокры снег). Стане яшчэ халадней. Тэмпература паветра ўначы на нядзелю складзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, па поўначы — да 6-9 марозу. Удзень чакаецца ад плюс 2 градусаў да 5 цяпла. А вось такі тэмпературны фон разам з дажджом і мокрым снегам цяжка назваць камфортным надвор'ем. Вясна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2015 года!**

**Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.**

**Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.**

# Ва ўсім павінен быць парадак

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка разгледзеў кадравыя пытанні, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

**Кіраўнік дзяржавы назначыў:**
ЧЫЧУКА Сяргея Мікалаевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Малдова;
ПАНАМАРОВА Аляксандра Леанідавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Іарданскім Хашыміцкім Каралеўстве па сумяшчальніцтве.

**Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:**
КОХАНА Аляксандра Васільевіча — старшынёй Брагінскага райвыканкама;
КАМКА Міхаіла Васільевіча — старшынёй Лельчыцкага райвыканкама;
ДАРАШЭВІЧА Віктара Рыгоравіча — старшынёй Светлагорскага райвыканкама;
КРАЎЧАНКІ Уладзіміра Мікалаевіча — старшынёй Чачэрскага райвыканкама;
ІГНАЦЕНКІ Сяргея Дзмітрыевіча — старшынёй Быхаўскага райвыканкама;
ЦАРЫКАВА Уладзіміра Леанідавіча — старшынёй Глускага райвыканкама;
ДЗЕМІДЗЕНКІ Сяргея Сяргеевіча — старшынёй Хоцімскага райвыканкама;
МАЦЕЛЬСКАЙ Ганны Мар'янаўны — кіраўніком адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Мінска;
ЛЕТАВА Ігара Леанідавіча — генеральным дырэктарам ААТ «Мінскі завод колавых цягачоў»;
ШЧАСНАГА Анатоля Тадэвушавіча — рэктарам Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта;
ПАСКРОБКІ Алега Рыгоравіча — першым намеснікам міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі;
КОРЧЫКА Дзмітрыя Аляксандравіча — намеснікам міністра прамысловасці;
ПІВАВАРА Васіля Пятровіча — намеснікам міністра сельскай гаспадаркі і харчавання — дырэктарам Дэпартамента ветэрынарнага і харчовага нагляду;
ПАРТНОГА Міхаіла Пятровіча — намеснікам міністра спорту і турызму;
ЗАДЗІРАНА Сяргея Уладзіміравіча — намеснікам міністра юстыцыі;
КАСОЎСКАГА Андрэя Аркадзьевіча — першым намеснікам старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях;
СЛАБАДЧУКА Аляксандра Іванавіча — начальнікам Сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Падчас узгаднення Аляксандр Лукашэнка падрабязна цікавіўся ў кіраўнікоў раёнаў Гомельскай вобласці, як вядзецца пасяўная кампанія на поўдні краіны, якія праблемы выяўляюцца ў сувязі з яе пачаткам. Прэзідэнт запатрабаваў звярнуць асаблівую ўвагу на культуру земляробства. «Спагнанне за гэта будзе вельмі сур'ёзнае. Я ўсіх губернатараў папярэдзіў. Усё павінна быць засеяна, кожны кавалак», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. «І прымусьце кожнага ўласніка падворка, прысядзібных участкаў не проста навесці парадак, а ўсё ўзараць, каб не было пустазелля», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы.

«Навядзіце парадак! На вуліцах, на прысядзібных участках і на сельгаспрадпрыемствах — ідэальны парадак! І зразумела, у аграгарадках і вёсках. Да Дня Перамогі гэтыя пытанні павінны быць вырашаны», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама акцэнтаваў увагу на правядзенні пасяўной. З-за няснежнай зімы вільгаці ў глебу трапіла менш, чым звычайна. «Таму вельмі важна як мага хутчэй зерне пакласці ў глебу», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Калі ў нас сапраўды ёсць рызыка не захаваць пасевы або атрымаць невялікія ўраджаі ў сувязі з вымярзаннем, вымаканнем, трэба больш рашуча дзейнічаць. Нельга страціць ураджай, нельга апусціцца ніжэй за ўзровень мінулага года», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Узгадняючы назначэнне рэктара Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што да рэктараў беларускіх ВНУ сёлета будуць асаблівыя патрабаванні.

На думку кіраўніка дзяржавы, рэктары «павінны быць моцнымі, весці за сабой моладзь». «Няпростая моладзь, гэта самая лепшая наша моладзь, разумная, з імі трэба ўмець весці дыялог і размаўляць», — адзначыў беларускі лідар.

Перад новым кіраўніком Мінскага завода колавых цягачоў Прэзідэнт паставіў задачу захаваць прадпрыемства. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што МЗКЦ — гэта добрае прадпрыемства, цікавасць да якога праяўляюць многія. «Але гэта дзяржаўнае прадпрыемства. І хацелася б, каб яно захавала сваю форму ўласнасці. Але для гэтага трэба прабівацца на новыя рынкі, не губляючы старых», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Назначаючы Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ў Малдове, Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь павінна пашыраць адносіны з гэтай краінай, зыходзячы з яе шляху развіцця.

# АДКАЗНАСЦЬ ЗА КРАІНУ

**На сёлетніх прэзідэнцкіх выбарах кожны чалавек будзе вырашаць лёс сваёй краіны. Такую думку выказаў Аляксандр РАДЗЬКОЎ, памочнік Прэзідэнта, старшыня РГА «Белая Русь», падчас пасяджэння рэспубліканскага савета арганізацыі.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Людзі да гэтага ставяцца вельмі адказна. Гэта рашэнне чалавека. Ён вызначае і свой лёс, і лёс дзяцей, а па сутнасці, усёй краіны», — адзначыў Аляксандр Радзькоў, маючы на ўвазе будучыя выбары.

Старшыня аб'яднання растлумачыў, што для падрыхтоўкі да выбараў РГА «Белая Русь» ужо створаны спрыяльныя ўмовы: «Мы сёння планамерна і прафесійна рыхтуемся да таго, каб удзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах і ўсёй сваёй арганізацыяй падтрымаць лідара нашай дзяржавы. Мы гэта робім арганізавана. У нас ёсць штабы — грамадскія прыёмныя. У нас ёсць актыў. У нас ёсць людзі, якія ўмеюць гэта рабіць».

Аляксандр Радзькоў таксама расказаў, што «Белая Русь» рыхтуецца да выбарчага працэсу як тэарэтычна, так і практычна. Пярвічная арганізацыя пры Нацыянальнай акадэміі навук дае ацэнку сучасных палітычных тэндэнцый, а прыкладную функцыю выконвае вопыт удзелу аб'яднання ў мінулых выбарах.

Сімвалічна і тое, што пасяджэнне рэспубліканскага савета адбылося ў будынку Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Як адзначыў Аляксандр Радзькоў, гэта папулярнае месца сёння. Штодзень у музеі праводзіцца каля 30 экскурсій. «Перш за ўсё ідзе моладзь. Прычым яны ідуць самі. Гэта ж відаць», — падкрэсліў старшыня «Белай Русі» і дадаў, што музей у будучыні зможа стаць пляцоўкай і для іншага кшталту выхаваўчых мерапрыемстваў. Напрыклад, для ўручэння грамадзянскіх пашпартоў моладзі.

Сёлета ўвага аб'яднання будзе скіравана і на святкаванне 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. У планах на гэты год — удзел членаў «Белай Русі» ў суботніках па добраўпарадкаванні мемарыяльных комплексаў, помнікаў, абеліскаў і брацкіх магіл ахвяр апошняй. Арганізацыя акажа таксама дапамогу ветэранам у добраўпарадкаванні жылля, падворкаў. Адбудуцца экскурсіі, чытацкія канферэнцыі і вечары памяці. Паведамляецца аб правядзенні канцэртаў для ветэранаў і пра аўтамотапрабег.

Акрамя таго, напрамкамі дзейнасці самага вялікага грамадскага аб'яднання краіны ў 2015 годзе будуць прапаганда здаровага ладу жыцця, стварэнне ўмоў для шырокага прыцягнення насельніцтва да заняткаў спортам ды іншыя.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# Акцэнт на імпартазамяшчэнне

## зрабіў прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў на нарадзе па пытаннях развіцця прамысловага комплексу

**Пытанні развіцця прамысловага комплексу Мінскай вобласці абмеркаваны ў Стоўбцах з удзелам прэм'ер-міністра Беларусі Андрэя КАБЯКОВА. Перад пачаткам нарады ён наведаў філіял кіруючай кампаніі холдынга «Мінскі маторны завод» у г. Стоўбцы і Стаўбцоўскі філіял Гарадзейскага цукровага камбіната. Менавіта тут рэалізуюць перспектыўныя эканамічныя праекты. У прыватнасці, на маторным заводзе — па будаўніцтве вытворчасці высокадакладнага, высокатрывалага чыгуннага ліцця.**

Магутнасць новай вытворчасці складзе 50 тыс. тон чыгунных адліваў у год, а мяркуецца выпускаць больш як 120 найменняў адліваў рознай вагі. Праект коштам 110 600 тыс. еўра рэалізуецца ў дзве чаргі. Плануецца, што пасля яго завяршэння ў 2017 годзе на вытворчасці будзе працаваць 900 чалавек. Гэты праект дазволіць таксама знізіць залежнасць ад імпарту, паколькі сёння адліўкі маторнай групы для новых рухавікоў ЗLD, рухавікі экалагічнага стандарту Еўра-4 і 5 закупляюцца за мяжой.

Як адзначыў Андрэй Кабякоў, гэта вельмі цікавы праект. Тут устаноўлена самае новае сучаснае абсталяванне. Многія замежныя спецыялісты прыязджаюць на прадпрыемства, каб азнаёміцца з працэсам высокадакладнага, высокатрывалага чыгуннага ліцця. Паводле слоў прэм'ер-міністра, спачатку планавалася, што новая лінія будзе працаваць толькі для патрэб Мінскага маторнага завода. Аднак, як паказаў час, на прадукцыю паступае шмат заказаў — як з краін СНД, так і з іншых замежных краін. Таму вырашана гэтую вытворчасць максімальна развярнуць на экспарт. Разам з тым рабіць гэта трэба так, каб не нанесці ўрон прадпрыемству.

Стаўбцоўскі філіял Гарадзейскага цукровага камбіната ў 2014 годзе закончыў рэалізацыю праекта па арганізацыі новай вытворчасці пладова-ягадных напаўняльнікаў для малочнай і кандытарскай прамысловасці. На гэта затрачана 53 млрд рублёў без уліку падатку на дабаўленую вартасць.

У межах праекта было распрацавана больш як 700 лабараторных узораў напаўняльнікаў для вытворчасці зерневага тварагу, глазураваных сыркоў, тварожнай пасты, кефірнага прадукту, ёгурту і марозіва, якія карыстаюцца попытам сярод шматлікіх кампаній Беларусі.

Вядзецца таксама работа па выпуску прадукцыі ў інавацыйнай упакоўцы bad-in-box. Сёння ў гэтай «адзежцы» выпускаецца бярозава-яблычны сок ёмістасцю 5 літраў. Такі від прадукцыі запатрабаваны ў гандлёвых пунктах, асабліва ў Мінску. Прадукцыю пастаўляюць таксама ў Расійскую Федэрацыю і Казахстан.

Прэм'ер-міністр засяродзіў увагу прысутных на тым, што раней філіял Гарадзейскага цукровага камбіната належаў прыватніку. Але яго кіраўніку не ўдалося наладзіць эфектыўную работу. «Цяпер жа тут зроблена вельмі добрая сучасная вытворчасць, запатрабаваная найперш з пункту гледжання імпартазамяшчэння», — лічыць кіраўнік урада.

Да нядаўняга часу значныя аб'ёмы харчовых напаўняльнікаў закупляліся за мяжой. Андрэй Кабякоў выказаў упэўненасць, што ў бліжэйшай перспектыве доля малочнай прадукцыі, дзе выкарыстоўваюцца напаўняльнікі айчыннай вытворчасці, павялічыцца.

«У цэлым, што датычыцца прамысловага сектара Мінскай вобласці, тут ёсць пэўныя праблемы. Разам з тым наяўнасць менавіта такіх прадпрыемстваў будзе садзейнічаць развіццю эканомікі», — падсумаваў вынікі візіту Андрэй Кабякоў.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

70 1945 2015 гадоў Вялікай Перамогі

# ПАСПЕЦЬ ДА ЮБІЛЕЙНАЙ ДАТЫ

## Рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу «Курган Славы» будзе завершана да 1 мая

**Пра гэта паведаміў старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА падчас выязнога пасяджэння аргкамітэта. Каля 10 гадоў таму прафсаюзы ўжо займаліся аднаўленнем комплексу. Тады быў створаны музей баявой тэхнікі пад адкрытым небам. Аднак за мінулыя гады асобныя элементы мемарыяла састарэлі. «Пастараемся зрабіць усе рамонтныя работы ў тэрмін, каб да юбілейнай даты курган меў урачысты выгляд, — запэўніў Міхаіл Орда. — Рэканструкцыя фінансуецца за кошт прафсаюзных сродкаў. Якая сума будзе зрасходавана, складана сказаць. Колькі неабходна, столькі грошай і ўласных сіл выдаткуем. Прафсаюзы актыў будзе выязджаць і бясплатна дапамагаць будаўнікам. Гэта справа гонару — прывесці мемарыял у парадак».**

Прыемна, што ідэю праекта прапанавалі менавіта маладыя спецыялісты.

У падсветкі будзе штодзённы і святочны варыянт. Асвятленне афарбуе барэльеф у янтарны колер і створыць эфект гарэння Вечнага агню.

Дарэчы, да 70-годдзя Вялікай Перамогі сіламі прафсаюзаў будуць адноўлены і іншыя знакавыя аб'екты воінскай славы. Сярод іх — мемарыяльны комплекс «Шаўлічы» (у Валкавыскім раёне Гродзенскай вобласці), помнік у Віцебску, дзе пахаваны Герой Савецкага Саюза партызанскі камбрыг Мінай Шмыроў і іншыя вядомыя камандзіры, памятны знак месца пахавання воінаў Чырвонай Арміі (Брэст), што загінулі ў 1941-1942 гадах у нямецкім лагеры «Рэвір».

Ужо пачалася рэстаўрацыя пано, мазаікі ордэнаў, назіральнай пляцоўкі. Адрамантуюць і прыступкі, што вядуць на вяршыню Кургана Славы. Па словах **генеральнага дырэктара «РасЕўраГруп» Юрыя КУЛІГІНА**, спецыялісты зараз ацэньваюць ступень пашкоджання лесвіцы. Прыступкі, якія нельга адрамантаваць, заменяць новымі. Цалкам абновяць травяное пакрыццё, бо гэтае сапсавалі краты, таму, каб пазбегнуць праблемы ў далейшым, пад новы газон пакладуць спецыяльныя сеткі.



З'явіцца сучасная падсветка, якая зробіць мемарыял больш заўважным увечары.

— Курган Славы знаходзіцца на трасе, што вядзе з аэрапорта ў сталіцу, таму ён можа быць візітнай карткай для гасцей, — гаворыць **Таццяна ДАНСКАЯ, кіраўнік студыі, якая займаецца праектам падсветкі.** — Мы паставім інавацыйнае энергазберагальнае абсталяванне. Такая ж святлодыёдная тэхніка выкарыстана на станцыях метро «Пятроўшчына» і «Малінаўка», у аздабленні будынка службы бяспекі Прэзідэнта.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

■ Гучная справа

# АСУДЖАНА МАЦІ-ЗАБОЙЦА

**У Брэсце вынеслі прысуд 20-гадовай жанчыне, якая забіла сваё пяцімесячнае немаўля ў лістападзе мінулага года.**

Хлопчыка ў цяжкім стане знайшоў бацька, калі вярнуўся раніцай з начной змены. Мужчына адразу выклікаў «хуткую дапамогу». Дзіця змясцілі ў рэанімацыю, але выратаваць малога не ўдалося. Траўмы аказаліся несумяшчальнымі з жыццём.

Тады ж затрымалі маці малога, якая і не стала адпірацца. У ходзе судовай справы высветлілася, што маладая жанчына піла, курыла, вяла амаральны лад жыцця, а дзіця разглядала як перашкоду для свайго прывычнага існавання. Пра гэта гаварылі сваякі гора-маці.

Учора калегія Брэсцкага абласнога суда абвясціла прысуд — 15 гадоў пазбаўлення волі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ Імпрэза

# Правільная кніга

**Галоўная кніга адна, а ў ёй усё: і любоў, і здрада, і дараванне, і зноў любоў — з разуменнем, што чалавек слабы, але можа ўмацаваць сябе, выхаваць душу. Добра, вядома, было б жыць адразу так, як прапануюць дзесяць біблейскіх запаведзяў, каб не было што выпраўляць. Як напісана ў Слове Божым. Але ж ці ўсе чыталі?**



Фота БЕЛТА.

Няма праблем пачытаць: цэлая выстава друкаваных выданняў прадстаўлена была на адкрыцці Дзён праваслаўнай кнігі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Выданняў сучасных, але зробленых з душой і для душы ў розных выдавецтвах: Беларускага экзархата, Свята-Елісавецінскага манастыра альбо брацтва ў гонар Архістратыга Міхаіла. Шмат выдавецтваў, якія з падобнай прадукцыяй стукаюць у сэрцы людзей і ўжо не з адной кнігай: да сучаснага чалавека мудрасць прыходзіць праз жыццяпісы святых, праз гутаркі і словы духоўных настаўнікаў, праз філасофскае асэнсаванне чалавечай гісторыі і развагі пра жыццё на прыкладах канкрэтных асоб. Кніга — больш чым чытанне. Кніга можа стаць суразмоўцай і дарадчыцай, і сябрам па жыцці.

— Усё ідзе наперад, развіваецца. Якім будзе заўтрашні дзень, вядома толькі Богу, але несумненна адно: калі чалавек будзе далучацца да духоўнай спадчыны, якую нам пакінулі нашы набожныя продкі, то гэтае развіццё будзе гарманічным, яно будзе ў міры, аднадумстве, любові і ўзаемнай падтрымцы, — **епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі Веньямін, старшыня Выдавецкага савета Беларускай Праваслаўнай Царквы,** у прывітальным слове на адкрыцці Дзён праваслаўнай кнігі засяродзіўся на традыцыі беларускай кніжнай культуры. — Сёння трэба клапаціцца, каб не знікалі тыя намаганні, якія рабіла прападобная Еўфрасіння, ігумення Полацкая, яшчэ сваімі рукамі перапісваючы кнігі і клапоцячыся аб іх распаўсюджанні. А пасля гэтую справу ўзнялі і іншыя нашы вялікія ўгоднікі Божыя: святціцель Кірыла Тураўскі, полацкія святціцелі Міна, Дыянісій, Сымон і іншыя. Хачу пажадаць, каб гэтая справа працягвалася ў наш час, і з яе дапамогай людзі рабіліся дабрэйшымі, чысцейшымі, больш дасканалымі, а разам з гэтым станавілася больш прыгожай наша родная краіна Беларусь.

Але каб думаць пра краіну, трэба глядзець у кожнага чалавека, які мае вырасці яе грамадзянінам. Пра выхаваўчую ролю кнігі казаў на ўрачыстым адкрыцці Дзён праваслаўнай кнігі **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, патрыяршы Экзарх усяе Беларусі:** так, мы цяпер усе «тэхнічныя» людзі, але тэхніка толькі дапамагае чалавеку (у тым ліку рабіць кнігі), а кніга з'яўляецца сапраўднай крыніцай мудрасці. Самых лепшых у гэтай справе адзначылі ўзнагародамі. Сярод іх тыя, хто трымае сцяг асветніцтва з часоў Еўфрасінні: выдавецтва Спаса-Еўфрасіннеўскага жаночага манастыра Полацка, ці вось яшчэ выдавецкі аддзел Гродзенскай епархіі ды гістарычная камісія Выдавецкага савета Беларускай Праваслаўнай Царквы. Але ж ёсць і моладзь, якая зусім не цураецца спраў духоўных — студэнцкі часопіс «Ступени» адзначаны граматай Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі.

Мінулае і сучаснасць не існуюць у адрыве адно ад другога. Дні праваслаўнай кнігі, якія праходзяць у розных гарадах, епархіях, установах нашай краіны, прымеркаваны да выхаду ў свет у 1564 годзе друкаванай кнігі «Апостала», выдадзенай Іванам Фёдаравым і Пятром Мсціслаўцам. Нам тут ёсць чым (і кім) ганарыцца. Гэта падкрэсліў і **намеснік Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Рэспублікі Беларусь Уладзімір ЛАМЕКА:** праваслаўная кніжнасць прадстаўляе значную частку гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа.

Словы правільныя. Друкаваныя. Прамоўленыя. І нават праспяваныя: хор «Усіхсвяцкі» і святочны хор Свята-Елісавецінскага жаночага манастыра дапамаглі адчуць узнёсласць слоў.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

# МАЛІЦЦА СА ШЧЫРЫМІ СЭРЦАМІ

**Набажэнствам з удзелам дзяцей у сталіцы завяршыўся багаты на падзеі візіт у Беларусь кардынала П'етра ПАРАЛІНА, Дзяржаўнага сакратара Ватыкана.**

— Калі я быў малым, нас не пускалі да касцёла, — расказваў падчас імшы дзецям у архікафедральным касцёле ў гонар Насвяцейшай Дзевы Марыі **мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ.** — Убачыць святара для нас было вялікай радасцю. А тут перад вамі найбліжэйшы супрацоўнік Папы Рымскага. Вы доўга будзеце памятаць тое, што адбылося. Але мы таксама хочам убачыць і Папу. Ці хочам, дзеці?

— Т-а-а-к! — жвава адгукнуліся на пытанне мітрапаліта дзеці, а пасля пачалі за ім скандзіраваць: — За-пра-ша-ем! За-праша-ем!

— Вы чуеце гэта? — з усмешкай спытаў у П'етра Параліна Кандрусевіч. — Калі дзеці просяць...

## ПРЫКЛАД МІРНАГА СУІСНАВАННЯ

Візіт да нас другой асобы Ватыкана быў багаты на дыпламатычныя мерапрыемствы. Яго графік распісаны па гадзінах. Кардынал сустракаўся з палітычнымі лідарамі Беларусі, прадстаўнікамі Праваслаўнай царквы, асвяціў вуглавы камень на месцы будаўніцтва нунцыятуры. Усклаў кветкі да манумента Перамогі, правёў прэс-канферэнцыю, на якой, між іншым, адзначыў, што запрашэнне пантыфіку наведаць Беларусь паступіла не толькі ад каталіцкай грамады, але і ад усіх галін дзяржаўнай улады. «Гэтае запрашэнне і жаданне ўбачыць Папу Францішка было агульным элементам усіх маіх сустрэч у дзяржаўных органах». Тэрміны візіту павінны вызначыцца ў далейшым. Ён таксама падкрэсліў добры клімат у адносінах паміж прадстаўнікамі розных канфесій у нашай краіне.

— Беларусь можа стаць прыкладам мірнага суіснавання прадстаўнікоў розных культурных і рэлігійных традыцый. Я думаю, Беларусь можа быць мадэллю для нашага свету, які пакутуе ад канфліктаў тады, калі тэтыя адрозненні, замест таго, каб станавіцца крыніцамі ўзаемнага ўзбагачэння, становяцца крыніцамі сварак і гвалту, — заўважыў П'етра Паралін.

Кардынал таксама выказаўся наконт паляпшэння адносін Беларусі з Захадам.

— З таго, што я бачыў, можна гаварыць пра намер з боку беларускіх уладаў да большай адкрытасці ў дачыненні да Еўрасаюза, астатняга свету. Ёсць глыбокая ўпэўненасць, ёсць дух, які рухае ватыканскай дыпламатыяй. Ён у тым, каб цяжкасці, якія могуць існаваць, вырашаць не праз закрыццё, ізаляцыю, а праз дыялог, узаемную дапамогу, што спрыяе збліжэнню і дапамагае рухацца па шляху да гэтых мэт. Святы прастол рады прапанаваць свой унёсак у гэты працэс. З нашага боку ёсць гатоўнасць дапамагаць гэтай краіне.

П'етра Паралін заявіў, што Ватыкан гатовы да візіту ў апостальскую сталіцу Аляксандра Лукашэнкі. Чакаецца толькі рашэнне з боку Прэзідэнта Беларусі і накіраванне запыту з удакладненнем даты візіту.

**Алег БУТКЕВІЧ, епіскап Віцебскі:**
*— Приезд кардинала — значная падзея для ўсіх католікаў Беларусі, знак увагі, якую аказвае да нашай краіны апостальская сталіца. Але гэта і абавязак для нас. Думка пра візіт Папы Францішка прысутнічае і ў нашых малітвах, і ў марах. І мы спадзяёмся, што прыезд П'етра Параліна з'яўляецца пэўным крокам да набліжэння гэтай падзеі. Зразумела, пра час, калі гэта адбудзецца, казаць цяжка. Аднак падобныя знакі ўзмацняюць нашу надзею.*

## «ГАНАРЫЦЕСЯ ТЫМ, ШТО ВЫ ХРЫСЦІЯНЕ, РАЗАМ З ВАШЫМІ БРАТАМІ ІНШЫХ КАНФЕСІЙ»

У два апошнія дні візіту прадстаўнік Ватыкана сустрэўся з вернікамі. У Чырвоны касцёл, на сустрэчу моладзі з кардыналам, як прызнаўся Тадэвуш Кандрусевіч, людзей прыйшло столькі, што не было чым дыхаць. Кожны хацеў убачыць весніка Папы Францішка. У «катэдры» таксама не было дзе прайсці. За некалькі хвілін да пачатку імшы ў мікрафон некалькі разоў настойліва паўтарылі, каб наперад прапусцілі дзяцей, якіх сабралася сапраўды шмат.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Папа добра ведае, што вас вельмі шмат у гэтай краіне, і што ў вашай гісторыі былі сапраўды цяжкія перыяды, — звярнуўся да прысутных кардынал. — Адказвайце на Божую любоў, працягвайце маліцца са шчырымі сэрцамі так, як гэта ўмее рабіць толькі славянская душа. Ганарыцеся тым, што вы хрысціяне, разам з вашымі братамі іншых канфесій.

На працягу сваіх сустрэч у Мінску П'етра Паралін некалькі разоў казаў журналістам пра тое, што хоча стаць для нас своеасаблівым папярэднікам прыезду Папы. А гэтым разам напрыканцы імшы заўважыў:

— Цяпер я разумею, што пасля вяртання ў Рым мушу выканаць вялікае заданне — перадаць Папу, што ў Беларусі яго чакаюць, і чакаюць з вялікай нецярплівасцю. Спадзяюся, Бог паскорыць гэты дзень, калі споўніцца вашае жаданне, якое супадае з жаданнем Папы, і ён зможа прыехаць да вас.

У Ватыкан ён узяў падарункі ад дзетак, вынікі сустрэч на самым высокім узроўні. Але хочацца верыць, што з сабой ён забраў і прыемныя ўражанні ад нашай краіны і яе жыхароў.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

■ Блізкая ўлада

# Камуналка, разбітыя дарогі, нясвоечасовыя разлікі...

У Магілёве зноў разбіраліся з праблемамі насельніцтва

**Магчымасць падзяліцца набалелым падчас прамой тэлефоннай лініі непасрэдна са старшынёй Магілёўскага аблвыканкама Уладзімірам ДАМАНЕЎСКІМ на гэты раз атрымаў 21 чалавек. Пытанні яшчэ 47 заяўнікаў, якія дазваніліся, узяты на кантроль і будуць разглядацца адпаведнымі службамі. Казаць пра спад папулярнасці такога фармату зносін з мясцовымі ўладамі нельга. Колькасць няспраўджаных званкоў зашкальвае — аж за 6 тысяч.**

Размова з насельніцтвам вялася ў рэжыме анлайн-канферэнцыі, і кіраўнікі раёнаў прымалі ў ёй непасрэдны ўдзел. Найбольш высокую актыўнасць праявілі жыхары Магілёва, Магілёўскага, Клімавіцкага, Дрыбінскага, Шклоўскага раёнаў. Былая работніца «Строммашыны» паскардзілася, што пры звальненні ёй не зрабілі канчатковы разлік. На гэтым прадпрыемстве цяпер сапраўды вельмі цяжкае становішча. Але жанчыне паабяцалі разабрацца з пытаннем і нават дапамагчы з працаўладкаваннем. Жыхарку Шклоўскага раёна хвалявала праблема водазабеспячэння. Яна паведаміла, што ў яе не хапае сродкаў, каб правесці ў дом ваду. Ёй адказалі, што азнаёмяцца з пытаннем і разгледзяць, чым можна дапамагчы. Наогул пытанні мала чым адрозніваліся па сваёй тэматыцы ад тых, якія гучалі раней. Зноў ішла гаворка пра жыллёвыя і камунальныя праблемы, добраўпарадкаванне, рамонт дарог у прыватным сектары, недахоп мясцовых кадраў...

«Так званых надуманых пытанняў не паступала, — падсумаваў вынікі трохгадзіннай размовы Уладзімір Даманеўскі. — Любы грамадзянін мае права звярнуцца ў органы выканаўчай улады са сваёй праблемай, і калі ён неадназоўна падымае адну і тую ж тэму, трэба зрабіць нейкія высновы. Часам гэта сведчыць аб нізкім узроўні тлумачальнай працы сярод насельніцтва. Галоўная наша задача — дамагчыся таго, каб пытанні людзей вырашаліся на ўзроўні тых органаў улады, у кампетэнцыі якіх яны знаходзяцца».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Энерганосьбіты

# Для нядбайных спажыўцоў — тарыф з каэфіцыентам 2

**Такім чынам, у нашай краіне павялічваюцца тарыфы на электрычнасць і цэны на газ для дзяржпрадпрыемстваў, якія ўжываюць энергарэсурсы звыш вызначанага ўрадам задання. Аб гэтым гаворыцца ў Пастанове Міністэрства эканомікі Беларусі №10 «Аб павелічэнні тарыфаў на электрычную энергію і цэн на прыродны газ у 2015 годзе».**

Цяпер прынятым дакументам павялічваюцца ў 2 разы тарыфы на электрычную энергію і цэны на прыродны газ, спажытыя звыш аб'ёмаў, вызначаных адпаведнымі заданнямі Пастановы Савета Міністраў №118, што прынята ў мэтах зніжэння спажывання электрычнай энергіі і прыроднага газу, павелічэння долі мясцовых відаў паліва ў кацельна-пячным паліве.

Адзначаная пастанова Саўміна тычыцца юрыдычных асоб і гаспадарчых таварыстваў з доляй дзяржавы ў статутным фондзе больш за 50% і гадавым спажываннем энергарэсурсаў больш за 1 тысячу тон умоўнага паліва, якія адносяцца да апрацоўчай прамысловасці. Сёлета такія структуры павінны знізіць спажыванне электрычнай энергіі і прыроднага газу на вытворчыя патрэбы не менш як на 3% да ўзроўню 2014 года. Выключэнне складае спажыванне прыроднага газу, які выкарыстоўваецца ў якасці сыравіны і для выпрацоўкі электрычнай энергіі ўласнымі энергакрыніцамі, а таксама электрычнай энергіі і прыроднага газу, якія выкарыстоўваюцца ўласнымі энергакрыніцамі для выпрацоўкі цеплавой энергіі, што адпускаецца іншым юрыдычным асобам і насельніцтву. Таксама дакументам прадугледжана, што арганізацыі ЖКГ камунальнай формы ўласнасці з кацельным абсталяваннем, якія працуюць на прыродным газе і мясцовых відах паліва (МВП), павінны выконваць памесячныя заданні па выкарыстанні МВП з улікам максімальна магчымай загрузкі кацельнага абсталявання. Такія заданні выдаюцца аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам.

Дакумент удакладняе, што павялічаныя тарыфы на электрычнасць і цэны на газ будуць дзейнічаць на працягу года, адразу пасля падвядзення вынікаў работы прадпрыемстваў за квартал.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Ігуменскі тракт
№ 10 (111)

■ Старасвецкая мода

# ЯК ДЭНДЗІ

**ЯНКА КУПАЛА быў самым вядомым дэндзі ў беларускай гісторыі. Але не першым. Нашы шляхціцы і магнаты напярэдадні Першай сусветнай вайны таксама апраналіся па такой модзе. Чаму? Проста нацыянальнае адзенне з-за шматлікіх паўстанняў і іншых гістарычных абставін было фактычна забаронена. Вось і даводзілася перадавой частцы грамадства калі не бараніць сваё, то хаця б прытрымлівацца моднага трэнду, пацвярджаючы прыналежнасць да еўрапейскай прасторы.**

Многія чулі пра тое, што Янка Купала апранаўся элегантна. Аднак каб зразумець, што гэта насамрэч значыць, варта ўбачыць прадметы з яго гардэроба (ці аналагічныя) на выставе «На старасвецкі лад» у Літаратурным музеі Янкі Купалы, што ў беларускай сталіцы.

Густоўна апрануты і стыльны. З палкай у руках і цыліндрам на галаве. З прыгожым партсігарам і кішэнным гадзіннікам. Менавіта такім паўстае вобраз паэта. Гледзячы на рэчы гардэроба Купалы, адразу можна ўявіць утульныя салоны, накрухмаленыя строі паненак і добрае віно. Аднак у яго вершах такое атачэнне не фігуруе. Муза накіроўвае паэта да мужыка — «пана сахі і касы». Відавочна, што класік жыў дзеля ідэі, кіраваўся бачаннем звыш. Знешне ў модным юнаку ўжо нічога не нагадвала хлопчыка са звычайнай вясковай хаты ў Вязынцы. Аднак у яго сэрцы, яго творчасць жыла спагада да гаротнага мужыка, да яго мовы...

Янка Купала працягваў традыцыю шляхецкага літаратарства, закладзеную Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам і Францішкам Багушэвічам. Гэта значыць, што шляхта, больш адукаваная, прагрэсіўная частка грамадства, якая мела і большыя фінансавыя і адукацыйныя магчымасці, ахвяроўвала сваю творчасць народу.



Кожная раніца дэндзі, якая астранамічна магла наступіць абсалютна ў любы час (нават пад вечар), пачыналася з навядзення лоску і прыгажосці. Трэба было мець акуратна дагледжаны вусы, але барада тады не дапускалася.

Куратар выставы «На старасвецкі лад» **Марыя БАРТКОВА** адзначыла:

— Каля 300 аўтэнтычных аксесуараў прыбылі да нас з Тракайскага музея, што недалёка ад Вільнюса. Ёсць сярод іх і цыліндры — яскравая прыкмета дэндзі. Гэта самы маляўнічы галаўны ўбор мужчыны, які рабіў яго высокім і стройным. Моцная палова карысталася імі амаль 100 гадоў. А дыпламаты насілі да 1970-х гадоў ХХ стагоддзя, бо гэтага патрабаваў этыкет. Ёсць вельмі арыгінальны від цыліндра — механічны капялюш, які называецца «шапакляк». Такі галаўны ўбор можна было проста ўдарам далоні ператварыць з высокага аб'ёмнага ў «блін». Гэта было вельмі зручна, калі чалавек ішоў у тэатр або ў госці — мог узяць яго проста пад паху, а калі трэба было, надаваў разгорнутую форму і надзяваў.

Кожная рэч, прадстаўленая на выставе, перадае шарм той эпохі і энергетыку майстра — можа быць, яна адзінкавая ў свеце. Прадметы зроблены з абсалютна розных матэрыялаў, багата аздоблены. Эпоха дэндзі скончылася з часам Першай сусветнай вайны.

На адкрыцці выставы ў Літаратурным музеі Янкі Купалы прысутнічаў **пасол Літвы ў Беларусі Эвалдас ІГНАТАВІЧУС.** Ён адзначыў:

— Прыгадваючы выставу асабістых рэчаў і прадметаў гардэроба Янкі Купалы, якая летась праходзіла ў музеі, я раблю выснову, што ён любіў прыгожа і якасна апранацца. Дагэтуль я думаў, што мужчыны не маюць патрэбы ва ўпрыгожаннях, але цяпер, калі бачу гэтую калекцыю, я вымушаны змяніць погляд. Дасягнуўшы такога ўзросту, калі амуніцыі натуральнай прыгожасці пачынае не хапаць, я буду больш актыўна цікавіцца прадстаўленымі тут атрыбутамі мужнасці. Гэтыя рэчы таксама нагадваюць нам пра якасць і прыгажосць ручной працы. Думаецца, нам трэба як мага часцей знаходзіць месца для такой прыгажосці ў кожным дні свайго жыцця.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**





БАЙКІ кухмістра ВЕРАШЧАКІ

# ДЗЕНЬ СВЯТОГА ПАТРЫКА, або Ірландска-беларускі fusion

**Наш час — час размывання межаў і разбурэння стэрэатыпаў, час нечуваных магчымасцяў і балючых страт. У ідэалогіі — постмадэрнізм, а ў кулінарыі — fusion (фьюжн), сплаў, амальгама, анаграма, гібрыд, эклектыка. Старыя каноны цешаць хіба што музейшчыкаў, усім хочацца парушаць звыклыя традыцыі, кукражыцца, эпаціраваць, блюзнерыць і піярыцца. Самыя дарагія і рэйтынгавыя рэстараны — «малекулярныя», якія раскладаюць звыклыя прадукты і ідэі ледзь не да ўзроўню амінакіслот, каб сінтэзаваць з іх ніколі не бачаныя дагэтуль бялковыя малекулы, з астранамічнымі рахункамі. Як доўга працягнецца гэты сусветны спажывецкі фэст — нікому невядома. Але заставацца зусім убаку ад такога моднага трэнду наўрад ці магчыма. Зразумела, такіх грандаў, як іспанскі рэстаран El Bulli або дацкі NoMa нам не дагнаць. Таму давайце арыентавацца на ўзоры больш сціплыя і блізкія нам па духу.**

Напрыклад, на ірландскую кухню. Чаму менавіта на яе? А таму што гістарычна нашыя лёсы досыць падобныя, таму што кухня ірландская — ніякая не арыстакратычная, а зусім свойская. Таму надта саромецца побач з ёй нам не прыйдзецца, як таму голаму ў правінцыйнай лазні.

Вучыцца менавіта ў ірландцаў сялянскай кааперацыі і байкотам нелаяльных землеўладальнікаў беларусаў заклікалі яшчэ ідэалісты-грамадоўцы 1920-х, але нашы недаверлівыя людзі дагэтуль чэшуць патыліцы, нетаропка разважаючы над сэнсам гэтых, як, зрэшты, і любых іншых ідэалістычных заклікаў...

Але ж я тут выключна пра кухню. Яшчэ зусім нядаўна асновай харчавання ірландцаў была бульба — яны сапраўдныя бульбашы! Ды і іншыя прадукты з ірландскага рацыёну былі да болю знаёмыя нашым продкам: авёс, жыта, шчаўе, капуста, буракі, бабы... Натуральна, свініна, а яшчэ болей — бараніна. Нашы дзяды таксама да сярэдзіны ХХ стагоддзя елі той бараніны нашмат болей, чым мы сёння. Карацей, амаль нічога такога, чаго б не было і ў нас, сярод інградыентаў ірландскага традыцыйнага меню няма. Хаця наша забыццё і абыякавасць да культурнай спадчыны непрыемна ўразіла б нават ірландцаў. Ну, хіба што з рыбай нашым далёкім бульбяным кузэнам пашчасціла болей: вакол Смарагдавага вострава — бурапеннае мора, і таму, якім бы цяжкім ні быў прыгнёт англійскіх лендлордаў, заўжды заставалася магчымасць або ўвогуле паплысці з радзімы ў шырокі свет, або, прынамсі, адплыць на некалькі міляў, каб закінуць невад у нязведаныя глыбіні на ўзор галілейскіх апосталаў, а там — селядцы або траска, або ласось...

А ў іх — ёд і фосфар, без якіх ніякія хітрыкі малекулярнай кухні не маюць «зялёнага» сэнсу. Вось таму і прыдумалі ірландцы апошняга часу розныя мудрагелістыя бізнес-схемы, кшталту бюджэтнай авіякампаніі Ryan Air, пачалі бязмежна багацець і нават займелі рэпутацыю «кельцкага тыгра...» Ну і мы ўжо, няспынна багацеючы, пачынаем рыкаць, мерачыся быць «балотным тыграм», крызіс нас пакуль што не палохае... Бачыце, колькі ў нас агульнага?

Ну і як жа не згадаць пра Ірландыю ў Дзень святога Патрыка, сусветнае свята не толькі ірландцаў, але і ўсіх п'яніц, прасцякоў, авантурыстаў, аптымістаў і аматараў мультсерыяла «Губка Боб»? Таму апранем у гэты дзень што-небудзь зялёнае і пад нярэдкія ўжо ў нас гукі ірландска-беларускай дуды выправімся ў найбліжэйшы традыцыйны беларуска-літвінскі паб годна адсвяткаваць. А пачастуюць нас няхай тымі стравамі ў стылі ірландска-беларускага fusion, якія цалкам маглі б быць на сталах нашых продкаў — а калі яны да іх не дадумаліся, дык я не здолею патлумачыць, чаму. Зрэшты, часам трапляюцца і зусім аналагічныя рэцэпты. Напрыклад, у нашай аграсядзібе мы часта робім гэтую простую, але вельмі смачную страву:

## ФАРШЫРАВАНЫЯ БУЛЬБЯНЫЯ ЛУПІНЫ



***Спосаб прыгатавання:*** Чыста вымытая бульба адварваецца «ў мундзірах» (або запякаецца ў мікрахвалевай печцы) да крыху няпоўнай мяккасці. Разразаецца напалам, лыжкай або нажом выдаляецца большая частка мякаці — асцярожна, каб не пашкодзіць лупіну. Мякаць разміначецца ў кашу (можна прапусціць праз мясарубку). Адначасова на адной патэльні падсмажваюцца шампіньёны з цыбуляй, а на другой — скваркі. Смажаныя грыбы, скваркі і пюрэ перамешваюцца, і гэтай сумессю начыняюцца (з «горкай») бульбяныя лупіны. Наверх кладзецца трохі маянэзу (прыкладна па 1 лыжачцы на лупіну), затым «бульбіны» выкладваюцца на бляху, змазаную алеем, і запякаюцца прыкладна пры 180 °С каля 30 хвілін. У посным варыянце можна абысціся без скварак.

***Між іншым:*** Гэты рэцэпт, з невялікімі адрозненнямі, ёсць у «Кухарцы Літоўскай» Вінцэнты Завадскай. Але вельмі падобны, таксама з пэўнымі адрозненнямі, лёгка знайсці ў інтэрнэце як ірландскі нацыянальны, пад назвай Irish Potato Skins. Таксама, наколькі я разумею, з 1974 года гэтая страва ёсць у меню сусветнай сеткі фастфуду T.G.I. Friday's. Вось так: хочаце — назавіце рэцэпт ірландскім, хочаце — беларускім або «літвінскім».

## СУП СА ШЧАЎЯ — ANRAITH SAMHAIDH

***(чыста ірландскі рэцэпт, які ну вельмі цяжка прызнаць чужым для беларусаў)***

***Складнікі:*** *1 фунт (450 г) шчаўя, 75 г масла, 1 вялікая пакрышаная цыбуля, 2 лыжкі мукі (з «горкай»), 2,5 літра булёну, 2 лыжкі сухароў, соль і перац, 2 жаўткі, 150 г вяршкоў.*

***Спосаб прыгатавання:*** Старанна вымыць шчаўе і дробна пасячы яго. Разагрэць у патэльні масла і крыху падсмажыць на невялікім агні разам шчаўе і цыбулю, каб апошняя толькі зрабілася крыху празрыстай. Пасыпаць мукой, перамяшаць і смажыць яшчэ 1 хвіліну, накрыўшы патэльню. Асобна давесці да кіпення булён. Дабавіць у яго падсмажаныя шчаўе і цыбулю, а таксама сухары. Пасаліць і паперчыць на смак. Давесці да кіпення, а затым варыць на вельмі слабым агні яшчэ гадзіну. (Можна дадаць крыху вады, калі зробіцца занадта густым.) Узбіць жаўткі з вяршкамі і дадаць у гарачы суп, выключыўшы гарэлку пліты і старанна перамешваючы.

# ПРЫЦЯЖЭННЕ РАДЗІННЫМ

Яўгена Пясецкага. Фота слова

**10 сакавіка наша газета надрукавала артыкул «Ад родных ніў...» доктара філалагічных навук, прафесара, загадчыка кафедры тэорыі літаратуры Белдзяржуніверсітэта Вячаслава Рагойшы, прысвечаны 150-годдзю з дня нараджэння ўнікальнага паэта-самавука Старога Уласа. Юбілейную дату пісьменніка, які стаяў ля вытокаў беларускай літаратуры, днямі адзначылі на яго радзіме ў Валожыне.**



**Кіраўніца «Руні», член Саюза пісьменнікаў Беларусі Валянціна ГІРУЦЬ-РУСАКЕВІЧ са школьнікамі каля выставы матэрыялаў пра жыццё і творчасць славутага земляка.**



**Унук Старога Уласа Герард СІВІЦКІ каля дзедавай хаты.**

***Па законах прыцяжэння зорка***
***цягнецца да зоркі.***
***Птушка цягнецца да птушкі.***
***Чалавек — да чалавека.***
***Па законах прыцяжэння ручайкі***
***цякуць з пагоркаў,***
***І шануюць валатоўку людзі***
***сённяшняга веку.***
***Па законах прыцяжэння ападае долу***
***лісце,***
***Каб навекі прытуліцца да радзіннага***
***карэння...***
***Гэтак я за небакраем заблукаў —***
***было калісьці,***
***Але зноў дамоў вярнуўся па законах***
***прыцяжэння.***

Думаецца, што закону сусветнага прыцяжэння падуладныя не толькі час, святло, рэальныя рэчы. Кожны прыгадае шмат прыкладаў таму, як нябачная сіла кліча, вядзе чалавека да мясцін яго дзяцінства, дзе ён пачуў першыя словы роднай мовы, упершыню убачыў птушак, што вярнуліся здалёк да сваіх гнездзішчаў. Праз непагадзь ляцяць буслы да родных буслянак, праз выпрабаванні імкнецца чалавек да сваёй роднай хаты, роднай мовы.

Сабраліся землякі-валожынцы ў Доме культуры, дзе на ўпрыгожанай сцэне стаяў партрэт Старога Уласа і гарэла запаленая па старым звычаі свечка памяці. У зале — валожынцы ўсіх узростаў, а на сцэне (недалёка ад вялікага экрана з краявідамі родных мясцін) — запрошаныя на свята ганаровыя госці: унук Старога Уласа генерал-маёр міліцыі ў адстаўцы Герард Сівіцкі, і прафесар Вячаслаў Рагойша.

— Шчыра кажучы, госцем сябе не лічу, — падзяліўся генерал-маёр. Я тутэйшы — нарадзіўся ў Валожыне восемдзесят гадоў таму. Тут дагэтуль стаіць родная хата майго славутага дзеда, адна з вуліц горада носіць яго імя, мяне і сёння пазнаюць сябры дзяцінства. Калі чытаю кнігу «Год беларуса» з творамі Старога Уласа — бачу сябе малога на тагачасных тутэйшых вуліцах. Шкада толькі, што да сучаснікаў дайшлі не ўсе творы дзеда...



**Кветкі да мемарыяльнай дошкі на доме Старога Уласа ўскладае прафесар Вячаслаў РАГОЙША.**

— Захавалася не ўся літаратурная спадчына Старога Уласа, — падтрымала размову перад залай кіраўніца валожынскага літаратурна-мастацкага аб'яднання «Рунь», член саюза пісьменнікаў Беларусі Валянціна Гіруць-Русакевіч. — Частка згубілася да Вялікай Айчыннай і ў гады ваеннага ліхалецця. Але і таго, што захавалася, дастаткова, каб усвядоміць веліч асобы паэта-самавука.

Цёпла сустракала зала прафесара Рагойшу, таксама земляка. Зборнік вершаў і публіцыстыкі «Год беларуса», які выйшаў у 1990 годзе, з'явіўся на свет дзякуючы менавіта яго шматгадоваму пошуку твораў Старога Уласа ў архівах, падшыўках старых газет і часопісаў. Ім жа была напісана выдатная прадмова да названага зборніка. Натхняла на такую карпатлівую працу не толькі зацікаўленасць навукоўца-даследчыка, але і прыцягненне творчасцю земляка, аддаленага ў часе, але блізкага праз агульную спадчыну: мову, прыроду, традыцыі валожынскага краю. Магчыма, сярод вучнёўскай моладзі з гэтай залы некалі з'явяцца новыя літаратуразнаўцы. У сваіх працах яны будуць спасылацца і на ўнікальныя творы Старога Уласа, і на аўтарытэтныя даследаванні прафесара Вячаслава Рагойшы.

Дарэчы, школьнікі самі прадэманстравалі на літаратурным свяце выдатныя веды творчасці Старога Уласа. Сёння шмат маладых валожынцаў займаюцца ў мясцовым літаратурна-мастацкім аб'яднанні «Рунь». У пакоі, адведзеным для занятак аб'яднання, выстаўлены ўпрыгожаныя ручнікамі партрэты многіх беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, што нарадзіліся на валожынскай зямлі.

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.**

■ Працяг тэмы

# «У КОЖНАГА СВОЙ ШЛЯХ ДА ПАЭТА»

**Амаль паўстагоддзя вывучаю творчую спадчыну і біяграфію Адама Міцкевіча. Наведаў некалькі музеяў і больш за 20 мясцовасцяў у Беларусі, звязаных з яго жыццём і творчасцю; праехаў па дарогах, дзе, магчыма, ён праязджаў з сябрамі; размаўляў з нашчадкамі людзей, якія бачылі паэта на ўласныя вочы, а пасля перадавалі міфы ў расказах аб гэтым з пакалення ў пакаленне. Дазвольце мне выказаць свой погляд на старонках газеты, як зрабіла гэта аўтарка артыкула «Быць ліцвінам: 5 доказаў» 6 студзеня 2015 года.**

У кожнага свой шлях да творчасці Адама Міцкевіча... Гартаю пажоўклыя старонкі шляхецкай гісторыі з 1811-1812 гадоў, трымаючы ў руках самы папулярны твор Адама Міцкевіча, сусветны шэдэўр паэзіі — «Пан Тадэвуш», які можна лічыць народнай эпапеяй. Ён становіцца жывым голасам мінулага і адначасова з'яўляецца ўспамінам і абяцаннем.



Да гэтай пары засталося ў памяці, як доўгімі зімовымі вечарамі бацькі чыталі паэтычныя творы Міцкевіча ў арыгінале. Многія з іх яны ведалі на памяць, часта спаборнічалі паміж сабой, хто больш успомніць. Вельмі запалі ў дзіцячую душу балада «Вяртанне бацькі», паэма «Пан Тадэвуш», «Гражына» і іншыя творы.

У дзяцінстве часта з бацькамі наведваў Вільню. Разам з маці наведваў музей паэта і іншыя мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю паэта. Кожны раз, ідучы ад чыгуначнага вакзала ў цэнтр горада, праходзілі пад Вострай брамай. Вядомыя радкі з паэмы «Пан Тадэвуш»: *«О Матка Боская, што ў Чанстахове ў храме глядзіш спагадліва, што ў Вострай свеціш браме...»* — літаральна самі зляталі з вуснаў, калі ўглядаўся ў гэты сімвал духоўнасці і веры.

Творчасць паэта звязана пераважна з гісторыяй Рэчы Паспалітай і народным фальклорам, але мова Міцкевіча з'яўляецца мовай шляхты той эпохі. Якая яна была, яго Айчына? Называлі па-рознаму, а была гэта дзяржава, складзеная з Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага. Былыя землі ВКЛ таксама тады ўваходзілі ў склад царскай імперыі Расіі. У перыяд жыцця Адама Міцкевіча не было нечага такога, як дзяржаўнае ўтварэнне Беларусь. Тэрмін «Беларусь» у тую эпоху для даўняга насельніцтва Рэчы Паспалітай і яе тэрыторыі, называнай цяпер Беларуссю, быў зусім чужы. Тамтэйшае насельніцтва таксама прызнавалася за «ліцвінаў», але адначасова звязвала сябе з польскай арыентацыяй. Міцкевічу былі далёкія прыдуманыя сёння нацыянальныя расслаенні ўнутры яго Айчыны. З аднолькавай любоўю ён ставіўся да ўсіх частак страчанай Бацькаўшчыны. Вось якія словы сказаў паэт: *«Я люблю ўвесь народ, хачу яго падняць, ашчаслівіць, хачу ім цэлы свет здзівіць»*. Увесь жыццёвы шлях і творчасць паэта дакладна паказваюць асобу. Трэба толькі ўважліва чытаць яго творы. Міцкевіч не раз абвяшчаў сваё паходжанне па нараджэнні — *«ліцвін, польскай нацыянальнасці»* або *«маю польскую нацыянальнасць, але ў мяне ўсё літоўскае»*.

Варта прыгадаць цікавы ліст да міністра адукацыі Францыі, напісаны Міцкевічам 4 кастрычніка 1849 года. На мой погляд, актуальны ён і сёння: *«...Славянскіх публіцыстаў і літаратараў раздзяляюць рэлігійныя і палітычныя погляды; яны хапаюць урыўкі маіх лекцый, перакладаюць іх фальсіфікуючы тэкст і каментуюць яго, кожны ў інтарэсе сваёй нацыянальнасці і партыі...»* (Тут і далей пераклад аўтара артыкула з польскай мовы.)

Адам Міцкевіч аказаў вялікае ўздзеянне на станаўленне польскай, літоўскай і беларускай літаратуры. Яго паэтычная і публіцыстычная спадчына належыць усяму свету; яго літаратура вучыць, цешыць і ўзрушвае аматараў творчасці паэта, людзей розных нацыянальнасцяў. Для мяне асоба Адама Міцкевіча з'яўляецца прыкладам духоўнай сілы і натхнення, паказвае іншы спосаб мыслення аб свеце, чым той, да якога мы прывыклі.



Каб яшчэ больш наблізіцца да гэтага генія літаратуры, больш даведацца пра жыццё і творчасць паэта, неадкладна пачынаю чарговае падарожжа ў Завоссе. Як сказаў калісьці вялікі нямецкі паэт Гётэ: *«Той, хто хоча зразумець паэта, няхай едзе ў яго краіну»*.

Ад станцыі «Гарадзея» еду электрычкай па чыгунцы Мінск — Баранавічы да прыпынку «Перамога». Выходжу з вагона, моцна трымаючы ў руках пастаяннага спадарожніка і вернага сябра маіх вандровак — веласіпед. Адсюль еду на ім на поўнач праз аграгарадок Крошын (былое мястэчка) Баранавіцкага раёна. Ад Крошына да Завосся — каля 14 кіламетраў шляху.

Дарога пралягае цераз поле, але неўзабаве прыводзіць да невялікага лесу. На дарожным паказальніку бачу надпіс: *«в. Завосse — 2 км»*. Паварочваю налева і еду проста да былога засценка Завоссе, дзе цяпер знаходзіцца *Музей-сядзіба Адама Міцкевіча.* З правага боку застаецца вёска, а з левага — мясцовы могільнік. Праз пэўны час бачу драўляныя будынкі, звяртаю ўвагу на тое, што выкананы яны дасканала і ўсім нагадваюць тыповы шляхецкі двор або фальварак дробнай шляхты. Цэнтральны будынак стаіць на месцы былога падмурка сядзібы Міцкевічаў. Навокал стаяць маладыя дрэвы, толькі адна ліпа, што абгароджана тынам, магчыма, з'яўляецца аўтэнтычнай — маўклівай сведкай мінуўшчыны. Побач з ёй ужо вырасла маладая ліпа і зараснік. Успамінаюцца паэтычныя радкі Адама Міцкевіча:

*...Дрэвы мае бацькоўскія!*
*Калі неба дапаможа,*
*Вярнуўся б на вас паглядзець.*
*Старыя сябры,*
*Ці знайду вас яшчэ?*
*Вы жывыя да гэтай пары?...»*

На гэтым найважнейшым шляху спазнання паэта наперадзе ў мяне яшчэ цэлы шэраг незвычайных падарожжаў па Беларусі: Карчэва, Туганавічы, Цырын, Варонча, возера Свіцязь, Плужыны, Чомбраў, Шчорсы, Рута, Навагрудак, Гарбатовічы, Сапліцова, Балценікі, Бенякані...

**Бярнард ПАКУЛЬНІЦКІ**

■

■ Ведай нашых!

# НЯХАЙ ЖЫВЕ ПРЫГАЖОСЦЬ!

## У Мінску ўшанавалі «жанчын года» Беларусі

**На некалькі гадзін у мінулую суботу гасцініца «Вікторыя» стала сапраўдным кветнікам, у якім расцвілі прыгожыя, актыўныя і цікавыя жанчыны. Тут адбылася цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2014». Здавалася, што нават паветра ў будынку перапоўнена хваляваннем і вясенняй радасцю.**



Фота БЕЛТА.

У фінальным спісе лаўрэатак аказаліся шматдзетныя мамы, урачы, педагогі і нават трактарысткі. «Сёлета мы ўнеслі некаторыя змены ў фармат конкурсу, — адзначыла **старшыня ГА «Беларускі саюз жанчын» і адначасова старшыня журы Надзея ЕРМАКОВА.** — Кандыдатуры выбіраліся больш дэмакратычна: усе пераможцы вылучаны абласнымі журы. Рэспубліканскае журы намінантаў зацвердзіла».

Узнагарод удастоены 43 жанчыны з усіх рэгіёнаў краіны. Прычым віншавалі іх, як і належыць, прадстаўнікі моцнай паловы чалавецтва. Уручаючы дыпломы і каштоўныя падарункі у намінацыі «За лідарства і паспяховае кіраўніцтва», **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ** адзначыў:

— Я вельмі ўдзячны за магчымасць быць на гэтым свяце,— сказаў ён са сцэны. — Прысутнасць у гэтым зале такіх паважаных людзей сведчыць аб важнасці конкурсу, аб значэнні і падтрымцы яго ўсім грамадствам.

Намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК віншаваў пераможцаў намінацыі «За дасягненні ў выхаванні дзяцей», Васіль СЕДЗІН, намеснік міністра харчавання і сельскай гаспадаркі Беларусі, ушаўноўваў намінацыю «За ўклад у адраджэнне вёскі». Падзякаваць пераможцам намінацыі «За ўклад у духоўна-маральнае адраджэнне нацыі» прыехаў айцец Фёдар ПОЎНЫ, настаяцель Усіхсвяцкага прыходу ў Мінску. Ён нагадаў, наколькі важная і вялікая роля адведзена жанчыне Богам, жанчыны ж, расчуленыя, ледзь стрымлівалі слёзы... Пераможцаў намінацыі «За ўклад у грамдзянска-патрыятычнае выхаванне моладзі» вітаў дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Мікалай СКОБЕЛЕЎ, які з задавальненнем павітаў намінантак і нават пакінуў ім нумар свайго тэлефона (як сам прызнаўся, з дазволу жонкі)...

— Такія конкурсы надаюць сілу жанчыне, — лічыць **Кацярына СТАНКЕВІЧ, пераможца ў намінацыі «За дасягненні ў выхаванні дзяцей»**. — Яна можа ўбачыць, што яе справа запатрабавана, што яе роля вялікая і будзе заўважана ў коле таленавітых, разумных, прыгожых і добразычлівых людзей.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

## Імёны пераможцаў

**«За лідарства і паспяховае кіраўніцтва»**

Дырэктар Брэсцкага філіяла РУП «Белпошта», дэпутат Брэсцкага гарадскога Савета дэпутатаў Валянціна ПУХ; загадчыца гарадскога радзільнага дома Аршанскай цэнтральнай паліклінікі Іна КРАЧАК, кіраўнік СЭЗ «Гомель-Ратон» Антаніна ЯЖОВА, намеснік генеральнага дырэктара Ваўкавыскага мясакамбіната Алена КАРАЖАН, старшыня Заслаўскага гарадскога выканаўчага камітэта і Заслаўскага гарадскога Савета дэпутатаў Святлана КАРТАШОВА, дырэктар філіяла №2 «Цэментторг» ААТ «Беларускі цэментны завод» у Касцюковічах Раіса САЎЧАНКА, загадчыца кардыялагічнага аддзялення 9-й гарадской клінічнай бальніцы» Ірына ГАЛАВАЧ і дэкан факультэта міжнародных эканамічных адносін БДЭУ, член-карэспандэнт Акадэміі навук Галіна ШМАРЛОЎСКАЯ.

**«За дасягненні ў выхаванні дзяцей»**

Маці-выхавацельніца дзіцячага дома сямейнага тыпу Баранавіцкага гарвыканкама Кацярына СТАНКЕВІЧ (яна выхоўвае 16 дзяцей), дырэктар дзіцячага дома г. Віцебска Наталля КУЛЬЦЕНКА, настаўніца рытмікі і танцаў Спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы №7 для навучэнцаў з парушэннем слыху г. Гомеля Ларыса ПАТРАЎКА, маці-выхавальніца дзіцячага дома сямейнага тыпу №2 Лідскага райвыканкама Ганна ТРУДНІКАВА (выхоўвае 10 дзяцей), кіраўнік-выхавальніца дзіцячага дома сямейнага тыпу Магілёўскага гарадскога выканаўчага камітэта Галіна АФАНАСЬЕВА (выхоўвае дзевяць дзяцей, усяго за 16 гадоў існавання ў гэтай сям'і выгадавалася 37 дзяцей, кіраўнік-выхавальніца дзіцячага дома сямейнага тыпу Жодзінскага гарвыканкама Маргарыта КАЛІНОЎСКАЯ (сямейную школу прайшлі ў гэтай сям'і 22 дзіцяці) і шматдзетная маці, аўтарка дзіцячых кніг, заснавальніца дзіцячай творчай карпарацыі «Кіндэрлэнд» Вольга КАЛАСОЎСКАЯ.

**«За ўклад у адраджэнне вёскі»**

Гаспадыня аграсядзібы «На Зарэчнай вуліцы» Ала ПАЛІКАРПУК, загадчыца малочнатаварнай фермы аграгарадка «Сватошыцы» Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці Алена БАБІЧАВА, начальнік участка саўгасакамбіната «Зара» Мазырскага раёна Гомельскай вобласці Ніна МІШОТА, загадчыца вытворчага ўчастка СВК «Хвіневічы» Святлана СКРУНДЗЬ, намеснік дырэктара ЗАТ «Палыкавіцкае» Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці Зінаіда ХАНЧЭЎСКАЯ і механізатар сельгаспрадпрыемства «Путчына» Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці Таццяна ЗАХОЖАЯ.

**«За ўклад у духоўна-маральнае адраджэнне нацыі»**

Загадчыца навукова-асветніцкага аддзела мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць» Валянціна АНЦІПАВА, кіраўнік народнага фальклорнага калектыву «Медуніца», а таксама дзіцячых калектываў «Чаўночак», «Вераніца» і « Завіруха» Ганна МАКРАВУСАВА, старшы выкладчык кафедры агульнай і карэкцыйнай педагогікі Гомельскага абласнога інстытута развіцця адукацыі», аўтарка больш як 40 публікацый на тэму духоўна-маральнага адраджэння Таццяна ХОРЫК, рэжысёр народнага самадзейнага калектыву тэатра народнай песні «Матуліна песня» Тэрэса АДАМОВІЧ, кіраўнік Уздзенскага раённага клуба каратэ-до «Бушыдо», сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы, пераможца чэмпіянату свету па каратэ-до Лілія ПЛАХАВА, галоўны рэдактар інфармацыйнага агенцтва «Магілёўскія ведамасці» Святлана ШУТАВА і дырэктар дома-інтэрната для пенсіянераў і інвалідаў у Мінску Вера ЛЯЙКОЎСКАЯ.

**«За ўклад у грамадзянска-патрыятычнае выхаванне моладзі»**

Дырэктар унітарнага прадпрыемства «Май Бэбі» ў Брэсце Ларыса МАЛЯЎКА, дырэктар Віцебскага абласнога музея імя Героя Савецкага Саюза М.Ф. Шмырова Ірына ШЫШКОВА, намеснік галоўнага ўрача па акушэрскай і гінекалагічнай дапамозе Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы Святлана МАЛЬЦАВА, кіраўніца школьнага музея і настаўніца гісторыі сярэдняй школы №35 горада Гродна Раіса ПРОХАРАВА, намеснік старшыні Круглянскага райвыканкама Магілёўскай вобласці Тамара АКСЁНАВА, старшыня Савета ветэранаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці Ганна ЧАЧОТКІНА і дырэктар Гімназіі №1 ім. Францыска Скарыны ў Мінску Наталля БУШНАЯ.

Аргкамітэт конкурсу заснаваў **спецыяльныя прызы «За вернасць Беларускаму саюзу жанчын».** Іх атрымалі Зоя КРОТ, Вольга КАШАВЕНКА, Таццяна ГАЛЬЦАВА, Людміла КРУПЕЦ, Зінаіда ЧУМАКОВА, Надзея ЛОСЬ, Таісія ПУЖЭВІЧ і Рэгіна ДАВІДОВІЧ. Усе яны некалі стаялі каля вытокаў стварэння БСЖ і ўнеслі вялікі ўклад у працу арганізацыі.

■ Прэмія ўрада

# Лідары якасці

**Лепшыя прадпрыемствы за дасягненні ў галіне якасці па выніках мінулага года атрымалі прэміі ўрада. Рашэнне камісіі па прысуджэнні прэмій зацверджана адпаведнай пастановай Савета Міністраў, апублікаванай на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

У дакуменце гаворыцца, што прэміі прысуджаны за дасягненне значных вынікаў у галіне якасці і канкурэнтаздольнасці атрыманай прадукцыі (работ і паслуг), укараненне інавацыйных тэхналогій і сучасных метадаў менеджменту. Лаўрэатамі прэміі за якасць сталі: закрытае акцыянернае таварыства «Інжынерна-экалагічны цэнтр «Белінэкамп», адасобленае структурнае падраздзяленне «Віцебскае вагоннае дэпо» транспартнага прадпрыемства «Віцебскае аддзяленне Беларускай чыгункі», таварыствы «Баранавіцкі аўтаагрэгатны завод», «Баранавіцкі малочны камбінат», «Бярозаўскі мясакансервавы камбінат», «Гроднапрамбуд», «Кераміка», «Керамін», «Малако», «Дарводаканал», «Гатэль «Мінск», дзяржаўнае прадпрыемства «Белгіпрадар», установы адукацыі — Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь і Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь.

Пацвердзілі званне лаўрэата прэміі за дасягненні ў галіне якасці 6 прадпрыемстваў. Сярод іх навукова-вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Навукова-тэхнічны цэнтр» ЛЭМТ «БелОМА», акцыянерныя таварыствы «Вегас», «Бярозаўскі сыраробны камбінат», «Гомельскі завод ліцця і нармаляў», «Гатэль «Турыст» і прадпрыемства «Нацыянальны аэрапорт «Мінск».

Спецыяльных узнагарод конкурсу на атрыманне прэміі за дасягненні ў галіне якасці 2014 удастоены таварыства «Кераміка» (спецыяльная ўзнагарода ў намінацыі «Лідарства» за ўклад кіраўніцтва ў дасягненне ўстойлівага поспеху арганізацыі) і Бярозаўскі сыраробны камбінат (спецыяльная ўзнагарода ў намінацыі «Сацыяльная адказнасць» за вядзенне арганізацыяй сацыяльна адказнага бізнесу і стварэнне ўмоў, якія забяспечваюць сацыяльную абароненасць усіх груп зацікаўленых бакоў (персаналу, спажыўцоў, партнёраў, грамадства).

**Сяргей ПАЛІНІН**

■

## З ГРОДНА Ў КАЛІНІНГРАД — ЗА ПАЎГАДЗІНЫ

Нацыянальная авіякампанія «Белавія» з 9 чэрвеня аднаўляе рэгулярныя рэйсы па маршруце Калінінград — Гродна — Калінінград. Рэйсы будуць ажыццяўляцца двойчы на тыдзень па аўторках і пятніцах. Вылет з Гродна ў 11.30. Працягласць палёту — 30 хвілін. На гэтым маршруце будуць эксплуатавацца канадскія рэгіянальныя самалёты CRJ-200, якія разлічаны на перавозку 50 пасажыраў. Пры падарожжы авіятранспартам няма неабходнасці ў атрыманні шэнгенскай візы, што значна спрашчае працэдуру афармлення праязных дакументаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703. |
| Продавец | **ОАО «РАТОН»,** г. Гомель, ул. Федюнинского, 19. |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| Административно-производственное здание | 5702,5 кв.м | 350/С-4686 | г. Гомель, ул. Карбышева, 9 |

**Общие сведения:** год постройки – 1990; 4 этажа; материал стен – ж/б панели, кирпичные.

**Составные части и принадлежности:** три пристройки (1990 г.п. пл. 991 кв.м; 744 кв.м; 71 кв.м); подвал (74 кв.м); крыльцо; сход в подвал; машинное отделение (38 кв.м); склад (пл. 591 кв.м, 2004 г.п.); склад (1976 г.п., пл. 21 кв.м); склад (1976 г.п. 27 кв.м); два навеса; забор (ж/б, пл. 248 кв.м); трое ворот металлических; тротуар (пл. 104 кв.м, асфальтобетонное покрытие по щебеночному основанию); тротуар (пл. 528 кв.м бетонная плитка по песчаному основанию); проезжая часть (асфальтобетонное покрытие по щебеночному основанию, пл. 5503 кв.м), бордюры тротуарные, бордюры проезжей части.

**Земельный участок пл. 1,4615 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации зданий административно-бытового и производственно-складского назначения.

**Начальная цена с НДС 20% – 13 597 620 000 бел. руб.**

Предмет аукциона обременен договорами аренды. 29 арендаторов. Помещения арендуются под офис (678,94 кв.м), под склад, производство (653,89 кв.м). Общая сумма арендной платы 612,2 базовой арендной величины.

**Земельный участок пл. 1,4615 га**, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации зданий административно-бытового и производственно-складского назначения.

**Задаток 10% от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **15** (пятнадцати) рабочих дней после проведения аукциона.

**Условия оплаты:** если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение **30** (тридцати) календарных дней после проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и возмещения суммы фактических затрат за организацию и проведение аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Аукцион состоится **24.04.2015 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703 ЗАО «Центр промышленной оценки».

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.04.2015 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Тел.: +375 17 280 36 37; +375 29 183 69 71.**
**www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**



ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **ЛОТ №1.** Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 250/С-26420, расположенное по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Гагарина, д. 36, площадь – 587,9 кв.м, назначение – административно-бытовой корпус, наименование – административно-бытовой корпус, начальная стоимость лота 889.200.000 белорусских рублей. **ЛОТ №2** Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 250/С-29233, расположенное по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Криничная, д. 4, площадь – 495,9 кв.м, назначение – здание многофункциональное, наименование – здание ремонтной мастерской, начальная стоимость лота 638.100.000 белорусских рублей. **ЛОТ №3** Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 250/С-29231, расположенное по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Криничная, д. 4, площадь – 504,4 кв.м, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание мастерской, начальная стоимость лота 664.200.000 белорусских рублей |
| **Собственник (владелец) имущества** | Витебская область. Право хозяйственного ведения, правообладатель: Дочернее коммунальное строительное унитарное предприятие «Полоцкая СПМК-36», УНП 300075137, юридический адрес: Витебская область, г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 52 |
| **Местонахождение имущества** | г. Полоцк По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к директору ДКСУП «Полоцкая СПМК-36» Кандыбо Владимиру Степановичу (раб. тел. 80214-42-22-66, т.м. 8029-713-66-35). |
| **Наличие обременений** | Нет |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. «Правды», 32 02 апреля 2015 года в 10.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 316 Судебный исполнитель Колядко Александр Михайлович, тел. (0212) 60 00 92 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 60 09 75 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001066 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 не позднее 14.00 01 апреля 2015 года. Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

■ Стыль жыцця

# «АРТЫСТЫЗМ У МЯНЕ АД МАМЫ»

## ЯК АЎТАРАМОНТНІК З БРЭСТА СТАЎ ЗОРКАЙ НА YOUTUBE


Алег НЕСЦЕРАЎ у цэнтры.

**Хто цікавіцца ўсім, што звязана з рамонтам, афарбоўкай, эксплуатацыяй аўтамабіляў, магчыма ведае відэаблог "Дзядзька Алежа", на якім брастаўчанін Алег Несцераў дае прафесійныя парады. І не толькі параду можна атрымаць на гэтым сайце, але і пэўны зарад бадзёрасці, бо Алег вядзе свае «рэпартажы» з гаража надзвычай артыстычна, а таксама знаёміць гледачоў са славутасцямі і краявідамі Брэста. Пачыналася ж усё з яго захаплення машынамі і аматарскай камеры... Не, пачыналася нават значна раней.**

Родам Алег з горада Бузулука Арэнбургскай вобласці. Потым сям'я пераехала ў горад Ухту Комі АССР. Там 19-гадовы кранаўшчык і заняўся ўпершыню рамонтам машын. Тэхніку ён любіў заўсёды, цікавіўся новым, не ленаваўся вучыцца сваёй прафесіі, і хутка ад кліентаў адбою не было. Каб трапіць у яго майстэрню-гараж, аўтааматары ў чаргу запісваліся. Бізнес ішоў нядрэнна, недахопу грошай малады кузаўшчык-рамонтнік не меў, але і трацці іх не саромеўся. У жыцці ўсяму знаходзілася месца: рэстаранам, забавам, алкаголю, і як вынік — дэпрэсіям. Як далей павярнуўся б яго лёс, Алег сёння ўявіць не можа, але ход жыцця літаральна перавярнуў адзін выпадак.

Вечарам ён ішоў па вуліцы свайго горада і ўбачыў пажар. Гарэў інтэрнат. Першы паверх быў у агні, з другога людзі скакалі на зямлю, а дым і агонь упарта паўзлі ўверх. У адкрытым акне пятага паверха крычалі і прасілі дапамогі дзве маленькія дзяўчынкі. Пажарныя былі ўжо ўнутры памяшкання, і толькі адзін з іх спрабаваў прыставіць драбіны да пятага паверха. Тады Алег сказаў яму, каб трымаў іх, а сам падняўся на самы верх, забраў дзяцей, спусціўся назад прыкладна да паловы і перадаў дзяўчынак у рукі пажарным.

**Цяпер яго відэаўрокі па доглядзе машыны паглядзелі больш за 10 мільёнаў чалавек. І сайт «Дзядзькі Алежы» прыносіць асноўны прыбытак.**

Нешта тады змянілася ў яго жыцці і ім самім. Ён па-іншаму стаў глядзець на сваё існаванне, на яго каштоўнасці і дробязі, стаў разважаць важнае і другараднае. Цяпер Алег кажа, што той пажар стаў адлікам новай эпохі ў яго асобе. Яшчэ некалькі гадоў пасля таго ў яго душы павольна выспявала рашэнне, і нарэшце аднойчы Алег Несцераў адважыўся змяніць усё. Паабяцаў сабе, што ў яго жыцці больш не будзе месца алкаголю, пустому марнаванню часу і непатрэбным дробязям. А каб не ўзнікала нават спакусы сустрэцца са старымі прыяцелямі, ён пераехаў у Брэст.

На той час бацькі ўжо жылі ў Беларусі, яны вярнуліся на сваю Радзіму пасля выхаду на пенсію. Такім чынам пяць гадоў таму Алег амаль у 38 гадоў пачаў жыццё спачатку, як ён кажа, у ціхім і прыгожым Брэсце. Заняўся тым, што ўмеў: купіў гараж і стаў рамантаваць машыны. Аднойчы для сваіх знаёмых аматарскай камерай ён зняў відэаролік як вучэбны дапаможнік па афарбоўцы машыны. Сябрам і кліентам спадабалася. А сваяк прапанаваў выкласці запіс у інтэрнэце. Нечакана для Алега адкліркнуліся адразу 700 чалавек.

Да таго Алег Несцераў не вельмі ўнікаў у тонкасці вядзення блога ды іншых інтэрнэт-праектаў, але, калі зразумеў, што гэтым можна зарабляць грошы, пачаў вучыцца. Цяпер яго відэаўрокі па доглядзе машыны паглядзелі больш за 10 мільёнаў чалавек. І сайт «Дзядзькі Алежы» прыносіць асноўны прыбытак.

Рамонтам былы майстар-самавучка фактычна болей не займаецца, бярэ ў работу толькі тыя машыны, якія могуць служыць вучэбным матэрыялам для яго ролікаў. У Алега шмат падпісчыкаў, але ён адказвае на ўсе электронныя пісьмы штодня. А іх, паводле слоў блогера, прыходзіць ад 700 да тысячы ў дзень. І пытанні задаюць не толькі пра машыны, але і пра жыццё наогул. Без увагі ён не пакідае ніводнае. Гэта работа займае па пяць, а то і болей гадзін у дзень. Астатняе — распрацоўка і запіс «новага курса». Ролікі трэба будаваць так, каб яны былі цікавыя аўтамабілістам.

**Паабяцаў сабе, што ў яго жыцці больш не будзе месца алкаголю, пустому марнаванню часу і непатрэбным дробязям. А каб не ўзнікала нават спакусы сустрэцца са старымі прыяцелямі, ён пераехаў у Брэст.**

Дарэчы, Алег здымае відэа не толькі пра машыны. Сваім карыстальнікам ён паказвае краявіды і славутасці Брэста, дзе першае месца займае Брэсцкая крэпасць. Расійскія падпісчыкі ў захапленні ад нашых дарог, ад чысціні і дагледжанасці горада.

— Многія захацелі прыехаць, паглядзець горад і ваколіцы, — распавядае Алег. — Летась адбылося нешта накшталт злёту аматараў блога «Дзядзька Алежа». Некаторыя прыехалі ў Брэст амаль за пяць тысяч кіламетраў. Сабралася 27 чалавек, былі госці з Омска, Томска, іншых гарадоў Сібіры. Я рады, што яны не пашкадавалі аб затрачаным часе і сродках, ім нашы мясціны спадабаліся.

— Не сумняваюся. Бо і экскурсавод у іх быў майстар справы. Нават аднаго роліка паглядзець дастаткова, каб адзначыць ваш несумненны артыстызм.

— Гэта ў мяне ад мамы. Вельмі шкада, што яна не дажыла да поспеху маёй справы. Думаю, яна парадавалася б за мяне.

Відавочна, што маці парадавалася б за сына, у якога ёсць любімая справа, якая дазваляе карміць сям'ю, клапатлівая жонка, дзве маленькія дачушкі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ Выпрабавана на сабе

# ПРОЙДЗЕМ У НУМАРЫ!

## Карэспандэнт «Звязды» прайшла гутарку падчас уладкавання на працу пакаёўкай і даведалася пра некаторыя асаблівасці гэтай прафесіі

### «Працаваць вы не будзеце!»

«На пастаянную працу патрабуецца пакаёўка. Акуратная, камунікабельная, старанная, энергічная, без шкодных звычак». Менавіта такія патрабаванні прад'яўляюць працадаўцы да пакаёвак. Дарэчы, сёння гэтая прафесія карыстаецца попытам. У інтэрнэце вы з лёгкасцю знойдзеце вакансіі пакаёўкі для працы ў гатэлі, офісе або кватэры. Пошукі «свайго месца» я пачала з тэлефонных званкоў у гатэль.

— Добры дзень! Чым магу дапамагчы? — прагучаў жаночы голас.

— Вітаю! Я нaконт працы пакаёўкай.

— Колькі вам гадоў?

— Дваццаць два!

— У 20 гадоў вы пакаёўкай працаваць не будзеце!

Без тлумачэнняў, чым так не спадабаўся мой узрост, і нават не развітаўшыся, трубку кінулі. Вядома, можна выказаць здагадку, у чым прычына такой недружалюбнай размовы. Напрыклад, супрацоўніца гасцініцы ўпэўнена, што дзяўчына не вытрымае моцнай фізічнай нагрузкі або заўсёды будзе баяцца сапсаваць свой манікюр (як вынік — няякасная ўборка). Па-мойму, гэта стэрэатыпы. Усё залежыць ад самога чалавека. Калі ён валодае неабходным узроўнем ведаў і жадае працаваць, дык навошта яму перашкаджаць?

Сваю ролю тут адыграла і зоркавая сістэма гасцініц. У трохзоркавы гатэль (сярэдні клас) чалавеку з вуліцы на працу уладкавацца можна, а вось з пяцізоркавым (клас «люкс») гэты нумар не пройдзе. Тут чакаюць людзей падрыхтаваных і, што называецца, правераных. Сёння дыпламаваных пакаёвак у нас рыхтуе толькі адна ўстанова — Мінскі прафесійна-тэхнічны каледж гандлю.



Другі мой званок аказаўся больш удалым. Дзяўчына з прыемным мяккім галасам адказала, што пасада, якая мяне цікавіць, ёсць, а мой узрост (а я ўжо адразу, «з парога» вырашыла пра яго сказаць, каб час дарма не губляць) ёе не пужае.

— Тэлефонныя размовы — гэта добра, але пагядзець на вас я таксама хачу. Чакаю заўтра ў першай палове дня, — прапанавалі на там канцы провада.

Мяне запрасілі на гутарку ў трохзоркавую гасцініцу.

### «Дыплом не патрабуем»

На першым паверсе гасцініцы мяне сустрэла ветлівы менеджар і правяла ў свой кабінет. У ліфце яна запыталася, адкуль я, чым займаюся, і больш маім «мінулым жыццём» не цікавілася.

— Працоўны графік — два дні праз два. Першы дзень вы працуеце з сямі раніцы да сямі вечара. Другі дзень атрымліваеца кароткім: з дзевяці раніцы да чатырох гадзін вечара. Трэці дзень — выходзіце ў начную змену, з сямі вечара да сямі раніцы, — адразу пачала ўводзіць у курс справы прадстаўніца гасцініцы.

Графік, увогуле, нядрэнны, аднак ёсць адзін нюанс. Выхадны пачынаецца з таго дня, калі вы прыйшлі з начной змены — у сем гадзін раніцы. Дзень атрымліваецца разбітым, а заслужаны адпачынак не зусім поўным.

— Скажу адразу: праца цяжкая. Бывае, з'яздаеж ўвесь паверх і прыбраць трэба адразу каля пятнаццаці нумароў! Абмежаванняў, якія датычацца ўзросту, у нас няма. Працуюць тут і 18-гадовыя дзяўчынкі, і жанчыны гадоў 50. Галоўнае — спраўляцца з пастаўленай задачай. Што датычыцца зарплаты, то разлічвайце на 4 мільёны беларускіх рублёў. Самі разумееце, дыплом аб вышэйшай адукацыі не патрабуем.

Дарэчы, пакаёўкі офісаў і кватэр атрымліваюць значна больш — каля 7 мільёнаў беларускіх рублёў. У гасцініцах класа «люкс» таксама іншая зарплаты.

### «А ў бутэльку ад віскі — сок...»

Каб я да канца зразумела, хто такія пакаёўкі і што яны робяць, мне прапанавалі далучыцца да Галіны Іванаўны, прафесіянала сваёй справы. Галіна Іванаўна працуе пакаёўкай ужо дзесяць гадоў.

— З формай у нас тут праблемы. Гасцініца звычайна не цікавіцца памерамі адзення сваіх супрацоўнікаў. Закупляюць оптам... Але табе мы абавязкова што-небудзь падбяром. І не такія худзенькія тут працавалі! — адразу раскрывае «карты» мая новая знаёмая. — Ніякіх ружовых калготак і высокіх абцасаў. Усё павінна быць строга!

Форму паабяцалі выдаць заўтра, а пакуль мы чакаем супервайзера. Ён размяркоўвае ўсіх пакаёвак па паверхах і раздае «раздрукоўкі». У тых, хто працуе тут даўно, ёсць свае любімыя паверхі, якія не мае права заняць «навічок». Супервайзер гэта ведае і не дапусціць памылкі. У раздрукоўках пазначаецца нумар пакоя, тып, час заезду і выезду. Спачатку прыбіраюцца тыя пакоі, куды вось-вось павінны заехаць пастаяльцы, а потым — усе астатнія.

— Пакаёўка павінна мыць падлогу, пыласосіць, выціраць пыл, мяняць пасцельную бялізну, прымаць нумар пры выездзе кліентаў. На адзін пакой адводзіцца прыкладна 45 хвілін. Але ўсё залежыць ад стану, тыпу і плошчы нумара. Добра яшчэ замежнай мовай валодаць. Калі ты не ведаеш яе дасканала, тады для пачатку вывучы фразы кшталту "Ці ўсё вас задавальняе? Патрэбна што-небудзь?" — падзялілася Галіна Іванаўна.

Расказалі мне і пра тое, што трэба прайсці медыцынскае абследаванне. Пакаёвак з захворваннямі органаў дыхання, сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэм на працу не возьмуць.

— У нумарах, дарэчы, ёсць міні-бары. За іх захаванасць таксама адказвае пакаёўка, якая абслугоўвае пакой. Бывае так, што пастаялец віскі за дзевяцьсот тысяч выпівае, а ў пустую бутэльку яблычны сок налівае. Пакаёўка паглядзіць — па колькасці ўсё супадае, а пры больш дбайнай праверцы выяўляе падман. Вось тады і даводзіцца са сваёй кішэні за «свята» кліента плаціць, — разгаварылася дасведчаная пакаёўка.

Галіна Іванаўна згадала і пра такія важныя для пакаёўкі якасці, як сумленнасць, ветлівасць, камунікабельнасць, цярплівасць і карэктнасць. І, напэўна, з гэтым цяжка не пагадзіцца. Тым больш, калі справа датычыцца працы з кліентамі, якія павінны захацець вярнуцца ў вашу гасцініцу яшчэ раз.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ**

■ Ну і ну!

# НІ САЛА, НІ ГРОШАЙ

**У Крычаве затрымалі ўкраінцаў, якія везлі на продаж паўтоны забароненага прадукту**

Пільнасць праявілі супрацоўнікі крычаўскага аддзела міліцыі на транспарце старшы сяржант Сяргей Федчанка і прапаршчык Сяргей Хальчыцкі, якія суправаджалі дызель «Сураж — Крычаў». Яшчэ ў Суражы яны звярнулі ўвагу на падазроных жанчыну з мужчынам, якія селі ў вагон з неймаверна вялікім багажом. Як потым высветлілася, 12 вялізных гаспадарчых сумак і поліэтыленавы пакет былі цалкам запоўнены салёным і вэнджаным салам. Яго там аказалася аж 513 кілаграмаў. Вось толькі не знайшлося дазвольных дакументаў на іх правоз.

— Высветлілася, што мужчына і яго дарослая дачка жывуць у Чаркаскай вобласці, — паведаміла **супрацоўніца аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Магілёўскага аблвыканкама Юлія ХАЛАМЕЕВА**. — Яны ехалі з мэтай прадаць сала ў Беларусі. Ведаючы, што на тэрыторыі нашай краіны дзейнічае забарона на ўвоз сала з іншых краін без дазволу Дэпартамента ветэрынарнага і харчовага нагляду, яны вырашылі паспрабаваць шчасця праз Расію. Спачатку дабраліся да Бранска, а адтуль прыбылі ў Сураж. Паколькі ніякіх іншых дакументаў, акрамя сваіх пашпартоў, яны не мелі, на іх быў складзены адміністрацыйны пратакол, а багаж канфіскаваны. Яго плануецца ўтылізаваць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■ Людзі і лёсы

# ДЗЕЛЯ КАХАННЯ

## Некаму (а, магчыма, нават многім, асабліва з маладых) гэта гісторыя падасца фантастычнай. Але насамрэч яна была...

**Пазнаёміліся яны ў аўтобусе. Невялічкая хораша апранутая дзяўчына з доўгімі, прыгожымі валасамі папрасіла Ігара падняць па паліцу ладную сумку з кнігамі. Вага яе і сапраўды была не пад сілу гэтаму танкляваму стварэнню, у асобе якога Ігар адразу ж прызнаў каляжанку-студэнтку.**

— Няўжо столькі «хвастоў»? — усміхнуўся ён, ды гэтак прыязна, што дзяўчына адразу адчула давер да гэтага крэпкага хлопца з добрымі вачыма і белазубай усмешкай.

Яны паехалі, і праз паўгадзіны Ігар ужо ведаў, што завуць дзяўчыну Наташай, што скончыла яна тры курсы гістфака, што «хвастоў» у яе няма, а столькі кніг яна вязе, каб даведацца, як тая ці іншая гістарычная падзея адлюстравалася ў мастацкай літаратуры. Вядома ж, казала, раманы Аляксандра Дзюма-бацькі не могуць быць крыніцай для вывучэння гісторыі Францыі, як і творы Валянціна Пікуля — для вывучэння расійскай... Але яны больш-менш дакладна перадаюць дух былых часоў і ў любым выпадку спрыяюць лепшаму засваенню гісторыі.

Даведаўся Ігар і пра тое, што Наташа едзе да мамы ў Бабруйск, што адтуль яны паедуць на мора пад Адэсу, дзе будуць купацца, загараць, чытаць, а ў непагадзь гуляць па гэтым вельмі своеасаблівым горадзе ды ладзіць культурныя праграмы.

У Ігара планы былі куды больш празаічнымі: накасіць вазоў восем сена, нарыхтаваць кубікаў дзесяць дроў, а з пачаткам жніва сесці за руль калгаснага камбайна, каб зарабіць грошай і толькі ў непагадзь абляцець любімыя грыбныя мясціны — назбіраць крэпкіх баравікоў з падасінавікамі ды лісічкамі.

За ажыўленай гутаркай час прайшоў незаўважна. Перад развітаннем яны дамовіліся сустрэцца 30 жніўня ў 6 гадзін вечара ля ганка філармоніі.

У ПРЫЗНАЧАНЫ час Ігар быў на месцы. Наташа таксама прыйшла. Яны трохі пагулялі па горадзе, пагаварылі пра лета, пагладзелі нейкі нецікавы фільм у кінатэатры «Мір» і дамовіліся пра чарговую сустрэчу пасля бульбы.

З кастрычніка яны сталі сустракацца амаль кожную суботу: хадзілі ў кіно, на канцэрты ў Палац спорту, у тэатры. Спачатку Ігар не разумеў, чым ён, звычайны вясковы хлопец, мог зацікавіць гэту гарадскую кнігалюбку. Стаў нават падумваць, што на ім яна правярае нейкія свае педагагічныя прыёмы. А яшчэ — адчуваць амаль фізічную патрэбу прытуліць да сябе гэта наіўнае дзяўчо, захінуць ад любога ліха. Перад канікуламі ён сказаў Наташы, што кахае...

Яна адказала, што верыць яму, але ж трэба скончыць навуку, а ўжо потым думаць пра далейшае жыццё.

На пятым курсе яны працягвалі сустракацца, і за час гэтых сустрэч для яго адукацыі Наташа зрабіла, здаецца, больш, чым усе інстытуцыі дацэнты разам узятыя. На Новы год ён яшчэ раз агучыў сваё прызнанне і сваю прапанову рукі і сэрца.

Гэтым разам Наташа ўжо згадзілася. Праўда, папрасіла перанесці ўсё на восень, а пакуль спакойна напісаць дыпломныя, здаць дзяржэкзамены. Да таго ж летам яна яшчэ раз, можа апошні, хацела з'ездзіць да мора.

...У Ігара размеркаванне адбылося на два тыдні раней за Наташына, і ён адразу ж падаўся ў «разведку». Даведаўся, што працаваць будзе галоўным інжынерам гаспадаркі, што тая гаспадарка гатова выдзеліць спецыялісту новы цагляны дом, дзе да жніўня абяцалі паставіць сталярку і зрабіць аздабленне.

Завітаў ён і ў школу: пацікавіўся ў дырэктара, ці будзе месца для будучай жонкі. Той на радасцях адразу ж пазваніў у рана, папрасіў пасадзіць на яе персанальную заяўку. Так што ўсе галоўныя жыццёвыя праблемы вырашыліся. І найлепшым чынам.

На працу Ігар прыехаў першым, купіў раскладную канапку, стол і два крэслы на кухню. Наташа з'явілася пазней, і гаспадар не без форсу паказаў ёй вялікі дом з прыбудовай, дзе была ванна, прыбіральня, халодная і гарачая вада, нават прыродны газ!

Уся гэтая раскоша стала магчымай толькі таму, што да 50-годдзя Кастрычніка ў мястэчку будавалі новую 3-павярховую школу і старшыня калгаса дамогся, каб у кацельні замянілі абсталяванне, якое дазволіла б штогод будаваць жыллё, але ўжо з выгодамі.

За працу Ігар узяўся з імпэтам. Найперш ён адрамантаваў бульбаўборачны камбайн, які гніў пад сцяной майстэрні, потым зварыў вялікі стэлаж для запчастак, навесіў нейкія хітрыя замкі на бочкі з палівам. І ўжо зусім расчуліўся старшыня, калі Ігар адправіўся на звалку, дзе скруціў і адрэзаў усё, што магло спатрэбіцца ў гаспадарцы.

НАТАША таксама ўпрэглася ў работу. Яна была паважлівай і да старэйшых, і да малых. Дырэктар школы не мог нацешыцца з новай настаўніцы, але ж пасля першай чвэрці запрасіў яе ў свой кабінет і сказаў: «Наталля Іванаўна, вы добрая настаўніца, вас нават дзеці хваляць. Але тое, што вы з Ігарам Міхайлавічам жывяце не распісаныя...»

Наташа пра гэта неяк не думала. Можа, таму што была шчаслівая?.. Але ж вечарам яна пагаварыла з Ігарам, і ў апошнюю суботу лістапада яны распісаліся.

А да таго...

Наташа неяк сказала Ігару, што не хоча цалавацца з курцом. Ён тут жа паабяцаў, што смаліць не будзе. Не толькі з прычыны жончынай просьбы. Ён проста палічыў, што пачак балгарскіх цыгарэт «БТ» каштуе 40 капеек. 30 пачкаў на месяц — гэта пенсія бабулі, альбо 85 булак хлеба. І ўсё на вецер... Чалавеку сямейнаму гэта не да твару было.

Зладзілі яны і вяселле, запрасіўшы ўсе мясцовыя вярхі, шэсць настаўніц з мужамі, некалькі студэнцкіх сяброў і сябровак. Прыехалі, вядома ж, бацькі жаніха, матуля маладой ды Ігарава старэйшая сястра з Салігорска. Вяселле было багатым дзякуючы цешчы. Гэта яна, загадчыца буйной крамы, навезла розных далікатэсаў, каньяку і заморскага віна.

І зажылі б яны нібы гогалеўскія старасвецкія памешчыкі (тым больш што напачатку лета чакалі малое), але... Чалавек мяркуе, а ваенкамат «перамяркоўвае». Праз тры тыдні Ігар атрымаў позву на вайсковыя зборы (як тады казалі, «у партызаны») у танкавы полк паблізу літоўскай мяжы, дзе (ну трэба ж!) спаткаў знаёмца — прапаршчыка, з якім некалі служыў у Польшчы. І хоць сябрамі яны не былі, але пасля адбою вырашылі сустрэцца ў прадуктовым складзе, якім той загадваў, выпіць пляшку-другую гарэлкі...

Недзе пасля першай перапыніў іх бяседу сігнал баявой трывогі — пачаліся манеўры. Праз чвэрць гадзіны ў Ігаравым танку заклініла рухавік. Пакінуўшы хлопца вартаваць танк і паабяцаўшы, што па яго зараз прыедуць, камбат рушыў далей, а Ігар застаўся. Каб не замерзнуць (слупок тэрмометра апускаўся тады да мінус 30) і не заснуць, ён наразаў кругі вакол танка, аж пакуль не пачуў з дзяцінства знаёмыя гукі: недзе непадалёк завылі ваўкі. Падумаў, што ўратавала б вогнішча, але ён не меў з сабою запалак. Прыйшлося залезці ў прамерзлы танк і чакаць — раз-пораз упадаючы ў нейкую дрымоту і не адчуваючы ні рук ні ног...

Прыехалі па яго толькі ў чатыры гадзіны раніцы і адразу павезлі ў райбальніцу. Пажылы хірург, убачыўшы Ігаравы ногі, абмацюкаў вайскоўцаў апошнімі словамі, але справу сваю зрабіў (не напісаўшы ў паперах пра стан ап'янення)... Вечарам, калі Ігар адышоў пасля наркозу, той жа доктар доўга сядзеў ля яго: падбадзёрваў, расказваў пра легендарную Зіну Тусналобаву, якая амаль з такімі ж траўмамі змагла не толькі жыць, але і нараджаць.

А Новым годзе Ігара адправілі на рэабілітацыю пад Мінск, у шпіталь для ветэранаў вайны, які асабіста апекаваў кіраўнік Беларусі, Герой Савецкага Саюза П.М. Машэраў. Ён не раз заязджаў туды, цікавіўся патрэбамі ўрачоў і просьбамі пацыентаў. Гэтым разам ён быў вельмі здзіўлены, убачыўшы сярод ветэранаў зусім маладога хлопца, спыніўся ля яго, распытаў, што здарылася. Ігар расказаў пра ўсё, што было (змаўчаўшы хіба пра сустрэчу з «прапарам»). Дадаў яшчэ, што патрэбаў ніякіх не мае і што жадае адна-го — як мага хутчэй вярнуцца дамоў, да жонкі.

— Маладзец! Герой! Ну, трымайся, а я чым змагу — дапамагу.

Пасля абеду да Ігара заявіліся двое пратэзістаў, зрабілі злепкі і праз два дні прынеслі гатовыя пратэзы. Кісці рук былі зроблены досыць удала. Аднятыя ж па калені ногі працінаў невыносны боль... Пратэзісты абяцалі, што з цягам часу ён, можа, пацішэе.

Праз тыдзень пасля гэтага Ігара прывезлі дамоў: спачатку з машыны «хуткай» дасталі інвалідную каляску з пратэзамі, потым на насілках вынеслі яго самога. Наташа плакала. І не зразумець было, ад чаго больш...

Назаўтра на «Волзе» прымчалася цешча, пакруцілася ў хаце, потым паклікала дачку на двор. Усю іх гутарку Ігар не чуў, але цешчыны словы: калека і развод у розных камбінацыях прагучалі выразна. Спрэчка доўжылася з паўгадзіны, але, мяркуючы па тым, што паабедаць цешча не засталася, да згоды яны не прыйшлі.

Прыехалі Ігаравы бацькі, прывезлі вясковых гасцінцаў і сказалі Наташы, што гатовы забраць свайго сына дамоў. Што пакуль жывыя, будуць дапамагаць ёй гадаваць дзіцятка. Але Наташа рашуча запярэчыла, сказала:

— Гэта мой муж, і глядзець яго буду я!

На развітанне свёкар са свякрухай упершыню назвалі яе дачушкай і з гэтым адбылі.

У красавіку прыбыў ваенны камісар, прывёз медаль «За баявыя заслугі», а як толькі падсохла зямля, завіталі старшыня калгаса з прарабам і сказалі:

— Няма чаго табе, Ігар Міхайлавіч, днямі кіснуць у хаце. Пакazвай, дзе паставіць альтанку. Хоць з людзьмі пасядзіш, пакуль жонка ў школе.

І да мая тая альтанка, нават зашклёная, стала справа ад сцежкі, што вяла ў дом.

Шостага чэрвеня Наташа досыць лёгка нарадзіла здаровую дачушку, і ў Ігара з'явіўся не толькі любімы занятак, але і яшчэ адзін сэнс жыцця. Ён навучыўся забаўляць і карміць малую, гадзінамі пільнаваў яе сон.

Праз два гады, калі стала бачна, што Наталля Іванаўна зноў цяжарная, мястэчка дружна загула: вар'ятка... Летам у сям'і нарадзіўся сын, а праз тры гады яшчэ адзін. Яго ўжо суседзі прынялі спакойна, як нешта належнае, бо за гэтыя гады Наташа стала спраўнай вясковай кабетай, у якой муж і дзеці дагледжаны, у хаце чыста, а ў гародзе ўсё расце.

Так ціха, мірна яны пражылі яшчэ 19 гадоў. Дзеці выраслі і разляцеліся хто куды, Ігар прачытаў усе кнігі з вялікай Наташынай бібліятэкі, пераключыўся на газеты і тэлевізар. Яны даўно ўжо спалі паасобку: Наташа — у спальні, Ігар — у зале, дзе тэлевізар... У адну зусім не цудоўную раніцу ён не прачнуўся — памёр у сне...

А Наташа, Наталля Іванаўна, жыве і сёння: чым можа, дапамагае дзецям, гадуе ўнукаў, кожны з якіх — свайго кшталту помнічак... Яе самаахвярнаму каханню.

**Віталь ГЕРАСІМАЎ,**
*г. Мінск.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ І жартам, і ўсур'ёз

# ТАКУЮ ЖОНКУ ПАШУКАЦЬ...

У маёй сям'і даўно за правіла: перад тым, як запрашаць гасцей, жонка складае спіс — доўгі такі, і ў ім, як правіла, два слупкі: «Падарункі» і «Правіянт». Потым грошы адлічвае. Праўда, не шмат.

— Можа не хапіць, — нервуюся я. — Глядзі, назваў колькі.

На дзіва спакойна жонка кажа:

— Не хадзі ў піўнушку. Менш куры ці зусім кінь... Не трэба грошы транжырыць на абы-што.

— Ладна! У мяне толькі дзве дурныя пазіцыі...

— А сотня кручкоў-паплаўкоў і іншых рыбалоўных прылад, не лічачы заморскага спінінга? Учора я правяла рэвізію...

Натапырыў я вушы: няўжо, думаю, падглядзела?

— Гэта ж дадумацца! Кручкі-паплаўкі свае гэтак захоўваць...

Значыць, знайшла! Пранюхала... Падчапіла, як таго шчупака, і будзе выводзіць на чыстую ваду.

— ...Кручкі — у тысячных загортвацьх, паплаўкі — у пяцітысячных... Ай галава!

— А што тут дрэннага?! Я ж так пазначаю сваё дабро, каб не падпісваць і ведаць — што дзе. Ноу-хау... Не трэба ні алоўка, ні паперы.

— Мільянер знайшоўся!

— Мы ўсе цяпер мільянеры, — удакладняю. — Капеек даўно няма. Затое кішэні цэлыя. Не трэба цыраваць. Калі сартую кручкі-паплаўкі свае, ды няма пад рукой паперы — усё ў ход ідзе. Аднойчы нават нейкі дакумент выкарыстаў... Ты ж памятаеш.

— Нейкі, кажаш? Наша пасведчанне аб шлюбе ў ход пайшло! Напакаваў, спарадкаваў... Дваццаць восем скрыначак!

— Дваццаць дзве, — папраўляю жонку. — Тры здвоеныя — адна ў адной. Жоўтыя бляшаначкі...

— А пра чырвоную, самую вялікую, забыўся? Дзе валюта схавана — долары, еўра. Нават юані ёсць. Вой, плача па табе турма, Коля!

— Не крадзеныя ж! Нікога не падманваў, хабару не браў. З заробленых іншым разам крыху сунеш не ў тую кішэнь. А потым знойдзеш, і ў галаве дурныя думкі пачынаюць круціцца: а раптам чорны дзень заўтра?! У каго ён не бывае... Асабліва ў такіх людзей — сціплых, сумленных — як мы з табой... Гэта ўсё наша, сямейнае. Агульны кацёл...

Мая Люся ўсміхаецца.

— Ладна, — кажа. — Кацёл дык кацёл. Таму заяўляць пакуль не пайду, будзь на волі, спатрэбішся...

— Абавязкова! — ківаю галавой. — Дзе твой спіс?

— Вось... І крыху грошай. Будзем лічыць — маіх. Астатняе — дабаўляй. Ты ж гаспадар, перагледзь сваю гаспадарку і — дзейнічай! Госці запрошаны.

Ну што тут будзеш рабіць?

У ціхім месцы паразгортваў я кручкі-паплаўкі ды блешні, падлічыў свае наяўныя рэсурсы, пайшоў па крамах.

І во цуд! На ўсё хапіла: і на падарунак жонцы, і на сувеніры гасцям.

— Вось гэта мужчына! — казалі яны, сабраўшыся за сталом. — Які густ, якое ўменне выбіраць!

І Люся не маўчыць: маўляў, толькі дзякуючы яму і стол гэты накрыты...

Ну як тут не ганарыцца сваёй жонкай! Яна ж — калі трэба — не толькі цудоўны кулінар і бухгалтар, але і Шэрлак Холмс. А што галоўнае — умее падбадзёрыць, пахваліць у складаную хвіліну. Іншым разам — прамаўчаць. Не панесці сямейны сакрэт на вуліцу. А тым больш — далей...

Так што наступным разам я хутчэй за ўсё разбяру і свой спінінг. Па вялікім сакрэце скажу: унутры яго, у тоўстым дзяржальне, і ў самім вудзільне ёсць шмат патрэбнага для нашага сумеснага шчасліва жыцця.

**Васіль НАЙДЗІН,** *г. Мінск.*


Марына ПАПОВА.


Вольга МАРШАЛКА.



Таццяна АБРАМАВА.


Уладзіслаў ІВАНОЎСКІ.


Кірыл РАМАНАЎ.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# ЦАНА

## КАБ НЕ ЛЯНОТА...

**— Няўжо беларусы не хочуць быць здаровымі і жыць доўга?**

**Вольга МАРШАЛКА:**

— Нашы грамадзяне па-ранейшаму думаюць, што здароўе — тое ж самае, што і ахова здароўя. Самае важнае для многіх, каб у паліклініках добра лячылі, каб былі пілюлі ад усіх праблем. Маўляў, мы будзем рабіць са сваім арганізмам, што захочам, а калі раптам... То ўрач усё адновіць. Па-першае, у паняцця «здароўе» ёсць канкрэтнае азначэнне. Гэта стан поўнага фізічнага, духоўнага і сацыяльнага дабрабыту чалавека, а не толькі адсутнасць захворванняў. Па-другое, ахова здароўя — гэта забеспячэнне на дзяржаўным узроўні даступнага медыцынскага абслугоўвання. Уласна медыцына, як вы разумееце, дае магчымасці, урачэбныя рэкамендацыі для аднаўлення здароўя, аднак яна не можа выконваць іх за нас.

Закон «Аб ахове здароўя» прадугледжвае не толькі абавязкі ўрача ў дачыненні да пацыента, але і адказнасць самога пацыента. Кожны з нас абавязаны клапаціцца пра ўласнае здароўе і прымаць своечасовыя меры па яго захаванні, умацаванні і аднаўленні. Вядома, што здароўе чалавека ўсяго на 10-15 працэнтаў залежыць ад сістэмы аховы здароўя, а на 50-55 — ад умоў і ладу жыцця.

Некалі ў чалавечай папуляцыі пераважалі інфекцыйныя захворванні, і яны былі асноўнай прычынай смяротнасці, аднак сёння статус эпідэміі набываюць цукровы дыябет, хваробы сістэмы кровазвароту, хранічная абструктыўная хвароба лёгкіх, траўмы. Сярод асноўных прычын смерці — сардэчна-сасудзістыя захворванні, новаўтварэнні і знешнія прычыны. Усё гэта даволі проста прафілактаваць. На жаль, нашы грамадзяне ў большасці сваёй легкадумна ставяцца да свайго здароўя. У першую чаргу трэба весці размову пра нізкую фізічную актыўнасць і няправільнае харчаванне...

**Даказана, што пры павелічэнні фізічнай нагрузкі можна знізіць колькасць хвароб сэрца, дыябету, раку малочнай залозы і раку абадочнай кішкі.**

**Марына ПАПОВА:**

— Наш камбінат створаны для арганізацыі лячэбнага харчавання пацыентаў, якія знаходзяцца ва ўстановах аховы здароўя з адпаведнымі захворваннямі. Адна з прычын іх узнікнення — якраз няправільнае харчаванне. Дарэчы, з ім звязана і зніжэнне імунітэту ў цэлым, так што харчаванне не можа быць нейкай кароткатэрміновай акцыяй, сядзеннем на дыеце, гэта павінна быць асэнсаванае рашэнне.

Сучасны чалавек амаль кругласутачна знаходзіцца ў чатырох сценах, ён надта заняты, як правіла, сядзячай працай. Пры гэтым яму няма калі перапыніцца на размінку, на абед. Толькі познім вечарам ён з'ядае ўсё тое, што павінен быў размеркаваць на тры-чатыры прыёмы цягам дня. А між тым якраз правільнае, дробнае харчаванне дае нам магчымасць прымаць эфектыўныя рашэнні на працы.

Як вынік — кожны трэці дарослы беларус пакутуе ад атлусцення або мае лішнюю вагу. Ужо нават кожны трэці школьнік з лішняй вагой, пры гэтым далёка не ўсе назіраюцца ў спецыяліста. Але аднойчы яны ўсё ж такі трапяць пад увагу ўрача — з хваробамі сэрца, сасудаў, суставаў, дыхальнай сістэмы...

Здаровы лад жыцця пачынаецца з рэжыму. З дня ў дзень неабходна трымацца пэўнай сістэмы — з пэўнай частатой прыёму ежы і дастатковай колькасці вадкасці (з разліку 30 мл на 1 кг вагі). Мы парушаем і пітны рэжым, і частату ўжывання ежы. А сама ежа, як правіла, аднастайная. Большасць насельніцтва злоўжывае простымі вугляводамі. Вядома, прасцей папіць чаю з нейкімі прысмакамі, заварыць хуткарастваральную кашу або шматкі. Аднак калі гэтыя вугляводы не задзейнічаць на фізічную нагрузку, то яны ператвараюцца ў тлушч. Нам патрэбна дастатковая колькасць бялку — мяса, рыбы, малака, здольных выклікаць пачуццё насычэння. Рыба не абавязкова павінна быць марская, ешце хоць бы тую, што ёсць на тэрыторыі нашай краіны. Вугляводы лепш спажываць складаныя, а гэта кашы, гароднiна, злакавыя.

**Уладзіслаў ІВАНОЎСКІ:**

— Калі нашы грамадзяне не зменяць сваю свядомасць, яны не заменяць сасіскі на рыбу, а булкі на яблыкі. Без матывацыі немагчымы ніякія змены.

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

У аснове любога дзеяння або з'явы — нашы думкі. На Усходзе найперш кажуць пра ўсведамленне мэты. Якая ў нас мэта ў дадзеным выпадку? Займацца аздараўленнем, папярэджваць ранняе развіццё цяжкіх захворванняў.

Безумоўна, найлепшы варыянт — прывіваць такія навыкі з самых малых гадоў. У Паўднёвай Карэі ў дзіцячых садках выкладаюцца базавыя веды суджок-тэрапіі, тлумачыцца, дзе на далоньцы размяшчаюцца кропкі, якія можна памасіраваць, каб зняць нейкія хваравітыя сімптомы. І малыя, і старыя там займаюцца гімнастыкай у парках. А як пачынаецца раніца ў Кітаі? На прыступках якога-небудзь банка 10-15 хвілін увесь персанал займаецца зарадкай.

**Таццяна АБРАМАВА:**

— Нам не хочацца быць адказнымі, намагацца, і мы надта верым у ратавальную пілюлю. Нашы пацыенты чакаюць, што пахудзеюць пасля першага сеанса іголкатэрапіі — проста таму, што яны на гэты сеанс прыйшлі.

## ШАГАМ МАРШ!

**— Якой у нас можа быць фізічная нагрузка?**

**Вольга МАРШАЛКА:**

— Недастатковасць фізічнай актыўнасці адзначаецца ў 35 працэнтаў дарослых, і толькі ў 35 працэнтаў дзяцей узровень фізічнай актыўнасці адпавядае норме. 6 з 10 чалавек ніколі або вельмі рэдка займаюцца фізкультурай і спортам. Гіпадынамія — праблема не толькі Беларусі. У Еўропе звыш 64 працэнтаў дарослых праводзяць звыш 4 гадзін у дзень у сядзячым становішчы. Наогул, недастатковая фізічная актыўнасць уваходзіць у лік глабальных фактараў, якія павышаюць рызыку заўчаснай смерці ва ўсім свеце. Даказана, што пры павелічэнні фізічнай нагрузкі можна знізіць колькасць хвароб сэрца, дыябету, раку малочнай залозы і раку абадочнай кішкі.

**Кірыл РАМАНАЎ:**

— У нас ёсць Закон «Аб фізічнай культуры і спорце», праграмы па фізічнай культуры для дашкольных устаноў, школ, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў, іншыя нарматыўныя дакументы, якія рэгулююць працэс арганізацыі і правядзення фізкультурна-аздараўленчай работы сярод розных груп насельніцтва. Таксама існуе шмат навукова-метадычнай літаратуры, напрыклад падручнік «Фізічная культура», у якім таксама даюцца патрэбныя рэкамендацыі.

У савецкі час фізкультура ў школе была тройчы на тыдні, бо яшчэ ў 1960-х даследаванні паказалі, што толькі для падтрымання здароўя патрэбны менавіта тры разы. Дадатковыя секцыі вітаюцца... Між тым, апошнія колькі гадоў фізкультура ў школе і вышэйшых навучальных установах — толькі двойчы на тыдні.

Тут патрэбна выпрацаваць звычку — рабіць зарадку, хадзіць пешшу. Паняцце мышачнага голаду вучоныя яшчэ не адмянілі. 90 працэнтаў беларусаў не так даўно былі сялянамі, займаліся цяжкай фізічнай працай. Цяпер такой працы няма, а таму неабходна сублімацыя, замяшчэнне.

Памятаеце, якім быў працоўны перапынак у фільме «Самая абаяльная і прывабная»? Усе бягуць гуляць у настольны тэніс. І так было на любой вытворчасці. Бо замежныя вучоныя ўстанавілі, што 15-20 хвілін заняткаў настольным тэнісам павышаюць працаздольнасць!

**Калі нашы грамадзяне не зменяць сваю свядомасць, яны не заменяць сасіскі на рыбу, а булкі на яблыкі. Без матывацыі немагчымы ніякія змены.**

Для нас найлепшым варыянтам было б вяртанне да таго, што існавала падчас савецкай сістэмы. Неабходна вывучыць мінулы вопыт і ўзяць тое, што не страціла актуальнасць. А пасля, дзеля разнастайнасці, можна прыгледзецца і да нечага замежнага. Тое, што добра для іх, можа абсалютна не падысці нам.

Адна справа, напрыклад, цыгун-гімнастыка, і зусім іншая — ёга, якая ўяўляе сабой філасофска-рэлігійнае, сур'ёзнае і глабальнае вучэнне.

Прыхільнік ёгі ў першую чаргу аднаўляе цыркуляцыю энергіі ў арганізме, а беларусы проста выконваюць асаны, фізічныя практыкаванні. Кожнае з іх павінна рабіцца на фоне правільнага дыхання. А ў нас, дарэчы, ёсць свая, запатэнтаваная, дыхальная гімнастыка!

А наогул, у 1980-х гадах у Індыі правялі адзіную за ўсе часы яе існавання дыспансерызацыю, падчас якой высветлілася, што найгоршы стан здароўя — у ёгаў. Па прычыне працяглага знаходжання ў неўласцівых для фізіялогіі чалавека позах і пастаянных «чыстак» арганізма.

**Таццяна АБРАМАВА:**

— Самае важнае ў любой практыцы — прывядзенне ў парадак думак. Пасля чаго можна прыступіць да выканання пэўных фізічных практыкаванняў.

**Уладзіслаў ІВАНОЎСКІ:**

— Так, ёга пачынаецца з ачышчэння мыслення. Далей неабходна вытрымліваць усе базавыя прынцыпы. Кожную асану — практыкаванне — неабходна выконваць, арыентуючыся на ўласныя адчуванні. Калі табе штосьці вельмі не падабаецца, ты адчуваеш унутраны дыскамфорт, значыць, займацца нельга. Пасля кожнага практыкавання трэба расслабіцца настолькі, каб аказацца на мяжы сну. Калі ты так не расслабіўся, значыць, гэта ўжо не ёга, а шкода. Вядома, ніводзін спартыўны цэнтр, які арганізуе падобныя заняткі, не можа дазволіць сабе іх правядзенне менавіта такім чынам — чалавек будзе расслабляцца даўжэй, чым выконваць практыкаванні. У харчаванні ўпор трэба рабіць на фрукты і гародніну, іначай будзе дрэнная расцяжка, іншая энергетыка ў арганізме. Трэба піць шмат вадкасці, абавязкова высыпацца. Калі вы недасыпаеце, то добрае выкананне практыкаванняў адыходзіць на задні план. Штодня вы павінны рабіць практыкаванні на мышцы спіны, брушнога прэса, рук, ног. Калі будзеце трэніраваць толькі мышцы рук, то гэта не ёга. Вельмі важна, аб чым вы думаеце непасрэдна падчас заняткаў. Калі робіце «бярозку» і не фіксуеце ўвагу на шчытападобнай залозе, то гэта таксама не ёга. Хочаце займацца ёгай — калі ласка, толькі рабіце ўсё правільна.

**У 1980-х гадах у Індыі правялі адзіную за ўсе часы яе існавання дыспансерызацыю, падчас якой высветлілася, што найгоршы стан здароўя — у ёгаў. З прычыны працяглага знаходжання ў неўласцівых для фізіялогіі чалавека позах і пастаянных «чыстак» арганізма.**

**Кірыл РАМАНАЎ:**

— І ўсё ж такі спачатку пацікаўцеся тутэйшымі методыкамі... А то ў нас заўсёды так. Нехта на Браславах ні разу не быў, затое Егіпет увесь пратаптаў.

**Вольга МАРШАЛКА:**

— Падтрымліваю! Чаму мы не хочам заўважыць турнікі ў дварах, хакейныя і футбольныя пляцоўкі?

## ПАЧЫТАЙ, ПАЦІКАЎСЯ

**— Як жа не набыць новых праблем, пачынаючы жыць на здаровы лад?**

**Уладзіслаў ІВАНОЎСКІ:**

— Можна было б сказаць: вазьміце гантэлі ды пачынайце... Але тут усё сапраўды складаней. Нездарма мы загаварылі вышэй пра свядомасць і змену думак. Каб не кінуць усё праз тыдзень, паспрабуйце зразумець, хто вы і што вы... Якой літаратуры больш на вашых паліцах? Што вы чытаеце? Чым больш вы разумееце нейкую тэму, тым больш яна ў вас пранікае, і вы становіцеся менавіта гэтым.

**Вольга МАРШАЛКА:**

— Вось чаму мы і кажам, што да таго, як пачаць займацца ёгай, трэба валодаць разнастайнай інфармацыяй, шмат цікавіцца і чытаць. Самаадукацыя — вельмі важны складнік здаровага ладу жыцця. Інфармацыя па аздараўленні абсалютна даступная. Трэба пачаць цікавіцца! Не можаце разабрацца, што ў інтэрнэце праўда, а што не — падыдзіце да ўрача, і ён падкажа, дзе лепей атрымаць тую ці іншую інфармацыю.

**Уладзіслаў ІВАНОЎСКІ:**

— Проста мы любім перакладваць адказнасць за сваё жыццё на дзяржаву, на доктара... Дарэчы, такое стаўленне ўласціва не толькі беларусам. Іншая рэч, за мяжой знаходзяць спосабы стымуляваць грамадзян клапаціцца пра сябе.

**Таццяна АБРАМАВА:**

— У нас таксама ёсць нейкія зачаткі гэтага. Некаторыя арганізацыі пазбаўляюць сваіх работнікаў-курцоў прэмій, забараняюць ім курыць і на сваёй тэрыторыі, і нават побач з ёй.

**Уладзіслаў ІВАНОЎСКІ:**

— Японец, які наймаецца на работу, павінен запоўніць велізарную анкету, дзе ёсць і пытанне пра біядабаўкі. Калі ён прапусціць гэта пытанне або напіша «абы-што», яго не возьмуць на працу толькі з гэтай прычыны. Бо ён настолькі неразумны, што не звяртае ўвагі на ўласнае здароўе. Там лічаць, што карысней для кампаніі ўзяць не такога падкаванага ў прафесійным сэнсе (можна падвучыць у працэсе), чым таго, хто будзе часта хварэць.

# ЗДАРОЎЯ

**Кірыл РАМАНАЎ:**

— Нашы людзі любяць прыкінуцца няшчаснымі, бо такіх шкадуюць, ім многае даруюць і менш з іх патрабуюць... Звычайна калі ў нас пачынаюць задумвацца пра здароўе? Калі яно пачало падводзіць. Калі стала цяжэй рабіць тое, што некалі давалася само сабой.

У фізічнай культуры ёсць прынцыпы свядомасці і актыўнасці. Прынцып свядомасці якраз аб тым, для чаго, навошта мне гэта. Калі знаёміцца з гэтым прынцыпам вам даводзіцца з прычыны пагаршэння здароўя, значыць, пачынаць трэба абавязкова з абследавання, з візіту да тэрапеўта. Тое, што ў школе вы няблага бегалі крос, ні аб чым ужо не гаворыць.

Агульныя рэкамендацыі могуць быць наступнымі. Перш за ўсё — самакантроль. Адсочваем пульс — у стане спакою, пасля 20 прысяданняў і пасля заспакаення...

Наогул, існуе методыка вызначэння ўзроўню здароўя: ён можа быць вельмі нізкі, нізкі, здавальняючы, добры, выдатны. Вызначце, на якім вы ўзроўні, а далей падбірайце тое, што вам падыходзіць. Ёсць вялікая колькасць комплексаў заняткаў для тых, хто належыць да груп вельмі нізкага і нізкага стану здароўя. Такой інфармацыяй можа валодаць і тэрапеўт, і ўрач лячэбнай фізкультуры, і валеолаг. Можна знайсці яе і ў інтэрнэце.

**Марына ПАПОВА:**

— Фізічную нагрузку можна распісаць прыкладна так, як урач-дыетолаг распісвае праграму лячэбнага харчавання.

**Вольга МАРШАЛКА:**

— Калі доктар патлумачыў вам стан вашага здароўя, далей, я мяркую, трэба ацаніць свой працоўны дзень — колькі ў нас ёсць часу і калі мы будзем займацца. Можа быць, гэта будуць проста пешыя прагулкі па дарозе на працу і з працы. Паводле нашых ацэнак, максімальная адлегласць, якую штодня пераадольваюць беларусы ва ўзросце ад 19 да 70 гадоў, — 1-2 кіламетры...

**Кірыл РАМАНАЎ:**

— А трэба каля 10! Гэта адпавядае нашым фізіялагічным патрэбам, нармалізуе працэсы метабалізму. Я кажу сваім студэнтам так: наш арганізм, калі мы рухаемся, — гэта рэчка з чыстай, празрыстай вадой, а калі ўвесь час сядзім — гэта багна.

## ШТО ТУТ РАСЦЕ, ТОЕ І ЕШ!

**— Здаровае харчаванне ў беларусаў павінна быць «сваім» ці лепш асвойваць тую ж міжземнаморскую дыету?**

**Марына ПАПОВА:**

— Першы важны момант у харчаванні — гэта рэжым, з гэтага трэба пачынаць. Важна харчавацца ў адзін і той жа час прыкладна чатыры-пяць разоў на дзень. Такім чынам наш арганізм будзе паспяваць падрыхтавацца да прыёму ежы, выпрацоўваць належную колькасць ферментаў. Нельга прапускаць снеданак, кубка кавы недастаткова. У першай палове дня метабалічныя працэсы праходзяць найбольш актыўна. Арганізму патрэбна энергія. Увечары ж метабалізм запавольваецца, а мы ядзім шмат, прычым паўфабрыкаты і фастфуд... Ніхто не кажа, што трэба цалкам забыцца на бліны, піцу, кашы, бульбу, макароны... Аднак яны не павінны быць у рацыёне штодня, тым больш у якасці вячэры.

**Уладзіслаў ІВАНОЎСКІ:**

— Пэўна, ведаеце, як харчуюцца барцы сумо? Днём амаль нічога, а ўвечары — вельмі шмат. Працяглласць жыцця ў іх — 35 гадоў.

**Кірыл РАМАНАЎ:**

— Гэта яшчэ можна зразумець, гэта свядомая ахвяра. Сумаіст — нацыянальны герой у Японіі. А дзеля чаго нашы людзі так робяць?

**Марына ПАПОВА:**

— Не рабіце рэзкіх перакосаў у харчаванні, не садзіцеся на дыеты, пасля якіх вяртаецеся да ранейшых звычак...

Яшчэ адзін важны момант — экзатычныя прадукты, фрукты. Не захапляйцеся імі! Манга, авакада, ананас цалкам даступныя, аднак генетыку не падманеш. Мы лепш засвойваем тую ежу, якую ўжывалі яшчэ нашы продкі, якая расла на нашай тэрыторыі. Калі людзей з поўдня прымусіць есці тое, што ўжываюць на поўначы, якасць іх здароўя хутка пагоршыцца.

Што да міжземнаморскай дыеты, то па-першае, гэта не дыета, а спосаб харчавання. На сёння ён лічыцца самым здаровым незалежна ад месца пражывання. І справа не ў аліўкавым алеі, а ў выкарыстанні алеяў для замяшчэння жывёльных тлушчаў. Аліўкавы, кунжутны, льняны, сланечнікавы — любы алей змяшчае амега-3 і амега-6 поліненасычаныя тлустыя кіслоты, адрозненне толькі ў суадносінах. Ільняны алей па сваіх карысных вартасцях не саступае аліўкаваму... Важна ўжываць алей нерафінаваны, неачышчаны, каб запраўляць ім салаты, не падвяргаць тэрмічнай апрацоўцы. Ачышчаны прадукт амаль не змяшчае карысных рэчываў.

Міжземнаморская дыета фарміравалася натуральным чынам. Старажытны італьянец браў з сабой на паству хлебную аладку, тварог да віно. Акрамя таго, у гэтых краях заўсёды было шмат гароднiны і фруктаў.

Я не заклікаю беларусаў адмовіцца ад бульбы. Трэба проста ведаць, што чым больш яна захоўваецца, тым менш у ёй вітаміну С. Трэба варыць яе ў мундзірах або запякаць, а не смажыць на сале. Не трэба есці бульбу штодня, забываецца на грэцкія крупы, хлеб з вотруб'ем. А наша малочная прадукцыя? Яна выдатнай якасці! Дабаўце мясцовую гародніну і фрукты. Рэкамендуецца каля 400-500 г фруктаў і гародніны ў суткі.

**Хіба можна пазбавіцца лішняй вагі, калі есці пасля сеансаў булачкі? У нас жа псіхалогія звычайна такая: зрабіце што-небудзь, каб я не таўсцеў, не курыў...**

Пры нейкіх хранічных захворваннях спачатку проста мяняюць тэхналогію прыгатавання страў. Перастаюць смажыць і пачынаюць запякаць, варыць, тушыць. Калі ж катэгарычна нельга штосьці ўжываць, шукаюць дастойную замену. Строгіх выключэнняў і забаронаў амаль не існуе. Дапусцім, ёсць людзі з недастатковай колькасцю ферментаў для пераграўлівання малочнага цукру (лактозы). Такі чалавек выдатна ведае, што цэльнае малако для яго — пад забаронай. Аднак можна ж ужываць кісламалочныя прадукты.

Неабходна сказаць яшчэ аб тым, што некаторыя аматары фізкультуры і спорту асцерагаюцца есці за дзве-тры, а то і болей гадзін да трэніровак. Незалежна ад таго, якая менавіта нагрузка нас чакае, ці маем мы на мэце пахудзець, прыкладна за дзве гадзіны да нашых заняткаў мы павінны ўжываць ежу. Пажадана вугляводную. Вугляводы пачнуць «спальвацца» ў арганізме і запусцяць іншыя энергетычныя працэсы. Калі ж мы займаемся на галодны страўнік, то ў арганізме актыўна распадаецца бялок і страчваецца вадкасць. Адбываецца так званая «ўсушка», што абсалютна нефізіялагічна і не стасуецца са здаровым ладам жыцця. Пасля заняткаў неабходна ўжываць ваду і бялковую ежу.

**Кірыл РАМАНАЎ:**

— «Усушка» азначае не што іншае, як старэнне арганізма. Наогул, аднаўленне арганізма адбываецца не ў момант заняткаў, а пасля іх. Як кажуць аматары бодзібілдынга, мышцы растуць, калі ты спіш. А непасрэдна ў момант фізічнай нагрузкі ў арганізме запускаюцца механізмы суперкампенсацыі. Калі мы трацім энергію, павышаюцца функцыянальныя рэзервы ўсіх сістэм. Арганізм «разумее», што заўтра зноў могуць быць нагрузкі, а таму спатрэбіцца запас сіл. Так адбываецца не проста кампенсацыя, а кампенсацыя з «запасам». Гэты працэс, праўда, не доўжыцца бясконца. Пасля кожнага цыкла — праз месяц ці квартал (у залежнасці ад таго, якой інтэнсіўнасці трэніроўкі) — неабходна рабіць перапынак для поўнага адпачынку цягам тыдня-двух. Так можна зноў запусціць працэс супераднаўлення.

## АБСАЛЮТНА НАРМАЛЬНЫ ЭГАІЗМ

**— Вядома, што фізічная нагрузка знімае стрэс, паляпшае эмацыянальны стан, але, можа быць, ёсць яшчэ якія-небудзь сакрэты падтрымання душэўнай раўнавагі і захавання псіхічнага здароўя?**

**Уладзіслаў ІВАНОЎСКІ:**

— Вазьміце на ўзбраенне адзін з найважнейшых прынцыпаў ёгі: скандэнтруй увагу на галоўным. На сабе і сваіх адчуваннях. Неабходна ўсвядоміць: Я заўсёды ў сябе з сабой? Я павінен быць уважлівым да сваіх фізічных адчуванняў і эмоцый. Прыгадайце, што сказаў Пятачок Віні Пуху: «Які сёння дзень?» — «Сёння мой любімы дзень!» Вось і вы гаварыце, як Пятачок.

Прыслухоўвайцеся да сябе. Не дапускайце пагаршэння сітуацыі, не назапашвайце адмоўныя эмоцыі. Разбірайце сітуацыі адразу або з нейкай рэгулярнасцю. З іншага боку, калі вы пачняце вытрымліваць рэжым сну і адпачынку, нармальна харчавацца, рухацца, то заўважыце, што дзень за днём вам становіцца лягчэй. Заўсёды пачынайце з сябе. Будзеце ў парадку самі — значыць, зможаце адэкватна ўспрымаць сваё акружэнне, значна больш дапамагаць некаму, калі спатрэбіцца. Гэта абсалютна нармальны эгаізм.

**Вольга МАРШАЛКА:**

— Калі вы кажаце, што вас «усё раздражняе», то насамрэч павінны разумець, што гэта проста вы раздражняецеся... З гэтага і пачынайце.

**Уладзіслаў ІВАНОЎСКІ:**

— Калі не ўдаецца справіцца самім, адчуваеце, што цалкам заблыталіся, трэба звяртацца да спецыялістаў — псіхолагаў, псіхатэрапеўтаў. Яны дапамогуць вырашыць праблемы за больш кароткі час.

Звычайна мала хто жадае напружвацца, працаваць над сабой. Большасць робіць стаўку на імгненны вынік, ратавальныя таблеткі. Тыя ж антыдэпрэсанты — гэта вельмі зручна. Прычым як для пацыента, так і для ўрача. «Хімія» дазваляе заглушыць тое, што застаецца нявырпаўленым. І не толькі беларусы пакутуюць ад лянoты. Нездарма Злучаныя Штаты называлі пэўны час «празак-нацыяй». Псіхатропныя рэчывы ўжывала да 60 працэнтаў амерыканцаў. Можна, безумоўна, есці і такім шляхам. Бо лекі варта прымаць працягла, і за гэты час сітуацыя, можа быць, разрулiцца сама сабой. Таблетка гарманізуе стан чалавека, дапамагае яму жыць пэўны час у гармоніі з сабой.

**Кірыл РАМАНАЎ:**

— Калісьці ў нас была распрацавана псіхафізічная гімнастыка. Гэткае лячэнне з дапамогай руху. Элементы такой гімнастыкі ўключалі нават у гімнастыку вытворчую. Стваралася гэта некалі на грунтоўнай навуковай базе.

**Тацццяна АБРАМАВА:**

— Гарманізаваць фізічны і псіхічны стан дапамагае тая ж іголкатэрапія. Яна можа выкарыстоўвацца як для зняцця непрыемных сімптомаў пры пэўных захворваннях, так і ў якасці прафілактыкі. Кітайская медыцына скіравана на гармонію цела і духу. Захворванні разглядаюцца як парушэнне цыркуляцыі энергій у фізічным целе. Іголкатэрапія наладжвае энергетычны паток, які здольны парушыць самыя розныя фактары. Тут важна, што і як мы ядзім, носім, як рухаемся і аб чым думаем. Захворванні ўзнікаюць, калі ўтвараецца лішак або недахоп энергіі. Энергія цыркулюе не толькі ўнутры нашага цела, але і звонку, вакол нас. Інь — энергія, якая ўнутры нас, ян — тая, што паступае звонку. Такім чынам, здароўе — гэта гарманічны рух унутраных і знешніх энергій.

**Ільняны алей па сваіх карысных вартасцях не саступае аліўкаваму... Важна ўжываць алей нерафінаваны, неачышчаны, каб запраўляць ім салаты, не падвяргаць тэрмічнай апрацоўцы. Ачышчаны прадукт амаль не змяшчае карысных рэчываў.**

Немагчыма паставіць іголкі і гарантаваць пацыенту, што праз пяць сеансаў ён будзе як новы, вечна малады і здаровы. Гэта толькі наша дапамога, падтрымка. Пацыент павінен сам нешта рабіць для свайго выздараўлення. Хіба можна пазбавіцца лішняй вагі, калі есці пасля сеансаў булачкі? У нас жа псіхалогія звычайна такая: зрабіце што-небудзь, каб я не таўсцеў, не курыў...

У іголкатэрапіі ёсць магчымасці прафілактыкі, але звяртаюцца да нас, калі гром ужо грымнуў і з'явілася праблема са здароўем. Самае папулярнае пытанне: якія гарантыі вы мне дадзіце? Ніхто не хоча нешта мяняць — урачы павінны гарантаваць! А ў нетрадыцыйных метадах лячэння самае важнае — уласнае жаданне хворага вылечыцца, мець адпаведны настрой на гэта. Калі пацыент не разумее, як многа залежыць ад яго, нічога не спрацуе...

**Уладзіслаў ІВАНОЎСКІ:**

— Мне прыгадваецца такі эпізод з жыцця... Сталы кітаец на прыёме ва ўрача скардзіцца на дрэннае самаадчуванне, захворванні, а ўрач яму кажа: «Ідзі спачатку паміріся з суседам...» Наш чалавек дакладна не вярнуўся б да гэтага ўрача. А кітаец пойдзе мірыцца, а па дарозе зойдзе на рынак па прадукты і набудзе тую гародніну і такі салат, якія будуць карыснымі для яго здароўя менавіта сёння, з улікам жыццёвых абставінаў і самаадчування.

**Тацццяна АБРАМАВА:**

— Кітайцы разумеюць, што ў рацыёне цягам дня павінна быць усяго патроху: салёнага, салодкага, горкага, кіслага, вострага...

**Марына ПАПОВА:**

— Трэба мець на ўвазе, што каштоўнасць харчавання ў апошнія дзесяцігоддзі знізілася ў некалькі разоў, а таму не варта забывацца на БАДы і вітамінныя комплексы. Адзінае, нельга лічыць іх панацэяй. Гэта проста асобны кампанент здароўя.

**Кірыл РАМАНАЎ:**

— Гадоў 20-30 таму я не сустракаў у навуковай літаратуры дакладных рэкамендацый адносна ўжывання вітамінных прэпаратаў пры занятках фізічнай культурай. Пэўна, у гэтым не было патрэбы. Аднак сёння такія рэкамендацыі існуюць.

**Вольга МАРШАЛКА:**

— Можна піць вітаміны і самастойна, без рэкамендацый, аднак хіба варта так пачынаць аздараўленне? Можа быць, у вас ёсць сур'ёзная праблема са здароўем, а вы будзеце цешыць сябе тым, што вітамінкамі робіце для сябе нешта карыснае. Пачніце з кансультацыі і абследавання.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ Карэспандэнт высвятляў сітуацыю

# Пераплаціла праз... картку

**Жыхарка Віцебска з прычыны няспраўнага банкаўскага тэрмінала заплаціла за тавар трайную цану. Непрыемная гісторыя адбылася яшчэ ў лютым. На момант падрыхтоўкі артыкула прайшло больш за тры тыдні. Але, сцвярджае жанчына, грошы, якія былі знятыя з карткі, так і не вярнулі.**

— Мы з мужам у той дзень купілі дзве бляшанкі марылкі і лаку вытворчасці вядомай замежнай фірмы для рамонту кватэры. Набывалі ў тым салоне і раней рознае. І ніколі да гэтага ў мяне не было ніякіх прэтэнзій да працы супрацоўнікаў гандлёвага пункта. Спрабавала аплаціць пакупку з дапамогай карткі Белінвестбанка. Я ўвяла пін-код, у выніку ні пацверджання таго, што грошы пералічылі, ні чэка. Работнік крамы сказаў, што ў касавым апараце скончылася стужка. Ён спрабаваў яе замяніць. Паўторная спроба разлічыцца за тавар скончылася няўдала. У выніку заплаціла наяўнымі грашыма — 380 тысяч 100 рублёў. Ура?! Рамонт працягнецца, наперадзе выходныя, ну што яшчэ трэба для шчасця?.. Калі мне тэрмінова трэба было зняць наяўныя з карткі, заўважыла, што на балансе не хапае 760 200 рублёў. Я адразу зразумела, што гэтая сума — кошт дзвюх няўдалых спроб разлічыцца карткай. Патэлефанавала ў кантакт-цэнтр Белінвестбанка, доўга чакала злучэння з аператарам і... У выніку даведалася, што мне трэба ў панядзелак ісці ў найбліжэйшае аддзяленне банка і пісаць заяву, — вельмі эмацыйна расказвае Вольга Клімовіч, аператар электроннага набору і вёрсткі.

Быццам бы, ну, здараецца. Але ж кліентка далей сутыкнулася з вялікімі праблемамі.

— Думаю, калі б тэрмінал у краме абслугоўваўся Белінвестбанкам, можа, праблема з вяртаннем грошай ужо даўно была вырашана. А так... 9 лютага напісала заяву ў Белінвестбанк. І ў аддзяленні, дзе яе прынялі, сказалі, што паперу разгледзяць на працягу 14 дзён. Гэтага не адбылося. 25 лютага патэлефанавала ў тое ж самае аддзяленне і запытала, куды паскардзіцца на дзеянні супрацоўнікаў банка, — працягвае Вольга.

Жанчыну імгненна пераключылі на супрацоўніка, які ветліва ўсё растлумачыў. Ён падкрэсліў, што ўжо двойчы быў адпраўлены запыт у Пріорбанк, але няма ніякай рэакцыі. Вольга трохі здзівілася, калі пасля таго, як расказала сваю гісторыю на старонцы Белінвестбанка ў сацыяльнай сетцы «Фэйсбук», патэлефанаваў работнік Белінвестбанка. Ён расказаў, што супрацоўнікі банка робяць усе магчымае, каб паскорыць працэс, а мой зварот патрабуе дадатковага разгляду, на што адводзіцца месяц. Мяне абяцалі трымаць у курсе спраў і даць пісьмовы адказ. На жаль, прозвішча супрацоўніка банка не запісала. Ніякага «руху ў працэсе».

Вольга плануе абараняць свае правы. Жанчына ўпэўнена, што заканадаўства аб зваротах парушана...

Па каментарый я звярнуўся ў пракуратуру Віцебскай вобласці.

Паводле закона «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб», заява або скарга грамадзяніна павінна быць разгледжана не пазней за 15 дзён. А такая, што патрабуе дадатковага вывучэння і праверкі, — не пазней за 1 месяц з дня яе рэгістрацыі ў арганізацыі. Калі патрабуецца больш часу, чым месяц, заяўніку ў 5-дзённы тэрмін з дня падаўжэння тэрміну разгляду звароту паведамляецца аб прычынах... І ў такім выпадку неабходна ўказаць тэрмін, неабходны для працягу разгляду звароту. На неатрыманне адказу на сваю заяву з банка грамадзянка мае права паскардзіцца ў іх вышэйшыя структуры.

У адпаведнасці з Кодэксам аб адміністрацыйных парушэннях, за парушэнні згаданых вышэй тэрмінаў разгляду звароту, прадугледжана накладанне штрафу — ад 4 да 10 базавых велічынь,— паведаміла «Звяздзе» **старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці па наглядзе за выкананнем заканадаўства аб зваротах грамадзян Ірына ТАЎТЫН.**

**P.S.** Калі артыкул рыхтаваўся да друку, Вольга паведаміла ў карпункт, што грошы — 760 200 рублёў — ёй вярнулі на картку! Жанчына праверыла яе баланс у пятніцу 13 чысла і вельмі абрадавалася! І вер пасля гэтага ў прыкметы і «няўдалыя лічбы»! А вось пісьмовы адказ яна так і не атрымала...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■ Факт

# УСЕ «ЗОРКІ» І СРОДКІ — ДЛЯ НАСЦІ

**У Гомелі з дабрачынным канцэртам выступяць «зоркі» беларускай эстрады. Імпрэза будзе прысвечана гомельскай школьніцы Настассі Юрчанцы, якая стала ахвярай ДТЗ у лістападзе мінулага года. Дзяўчынку збіла машына на пешаходным пераходзе недалёка ад дома па вуліцы Быхаўскай. Ініцыятарам збору сродкаў і арганізацыі мерапрыемстваў у падтрымку Насці стала «місіс Беларусь», гамяльчанка Юлія Перагудава.**

Яна лічыць, што акцыя "Горад-выратавальнік" патрэбна не толькі юнай гімназістцы, якая ў свае 15 гадоў перажыла кому і цяпер праходзіць складаную рэабілітацыю. Юлія падкрэслівае, што вельмі важна, каб усе жыхары абласнога цэнтра адчулі, што разам яны могуць дапамагчы аднаму канкрэтнаму чалавеку:

— Гэтай акцыяй мы хочам аб'яднаць увесь горад і паказаць, які важны ўнёсак кожнага чалавека ў добрую справу.

Дарэчы, прыняць удзел у канцэрце, які пройдзе 24 сакавіка ў Гарадскім цэнтры культуры, згадзіліся Уладзімір Ухцінскі, Аляксандр Саладуха, Макс Лорэнс, Дзядзя Ваня, калектыў Cherry Lady, а таксама маскоўскія спявакі Наталля Фацеева і Уладзімір Хазяенка. Весці мерапрыемства будуць Яўген Булка і сама Юлія Перагудава. Да акцыі далучыліся гомельскія аўтамабілісты, якія наляпілі на свае машыны лагатып марафону. Усе сабраныя ад канцэрта сродкі пойдуць на лячэнне дзяўчыны ў замежнай клініцы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**




## ХЛЕБ ДЫ СОЛЬ!

Так казалі і, дзякаваць Богу, па-ранейшаму кажуць беларусы, жадаючы некаму прыемнага апетыту...

Але ж самі яны на хлеб не налягаюць, шкадуючы фігуры, на соль — і пагатоў, маўляў, шкодная, асабліва — праз меру.

Вось тут можна паспрачацца, бо карысць таксама бывае! Прычым вялікая... Не верыце? Тады слухайце, што расказаў мне знаёмы пячнік. Бажыўся, што праўда!

Запрасілі яго ў суседнюю вёску печ рабіць. Справа для майстра прывычная, распачаў, кельмаю памахвае, цаглінкі кладзе. Гаспадар паблізу круціцца — то гэта падасць, то тое падасць. Гамоняць паміж сабою... А вось гаспадыні, прычым абедзве (і свякроў, і нявестка) нешта не ў гуморы: ні з кім не размаўляюць...

Ну і няхай сабе — пячнік на іх скрозь пальцы глядзіць (яго справа печ змайстраваць), але ж вочы не завязаны. Міжволі бачыць, што маладая гаспадыня ўзялася абед гатаваць. Паставіла на пліту чыгунок, наліла вады, бульбы накрышыла, пасаліла, недзе адышлася. Тым часам свякроў яе да пліты падступілася: зазірнула ў чыгунок, пакрышыла бульбы, пасаліла...

Зразумеў майстар, што ў абед варыва каштаваць не варта, бо не аматар ён перасоленых страў. А таму, улучыўшы момант, выцер ад гліны рукі, зачарпнуў солі і... таксама пасаліў — шчодра, не шкадуючы.

Прыйшла пара палуднаваць. Гаспадыні наставілі нейкіх талерак на стол, запрасілі мужчын і самі на лаўцы паселі. Гаспадар самагонкі ў чаркі наліў, выпілі... Міску з булёнам пячнік адразу ў бок адставіў: маўляў, не буду, і ўсё тут... Салам з гурком прыкусвае, а заадно пазірае, што далей будзе.

Бачыць — гаспадыні за лыжкі ўзяліся, варыва сваё паспыталі і скрывіліся.

Сербануў гарачага і гаспадар...

— Хто саліў? — пытае ў жанчын, грымнуўшы лыжкай.

— Я, — адказваюць абедзве.

— Самі салілі, дык самі і ешце! — загадвае ён.

Тыя адразу ж схіляюцца над міскамі.

...Пасмяяўся пячнік, гледзячы на гэта і, магчыма, забыўся б. Але...

Недзе праз месяц-другі пашчасціла яму вярнуцца ў гэтую хату і зноў жа міжволі заўважыць, што многае там змянілася. Прынамсі, нявестка, стоячы ля пліты, спытала ў свекрыві:

— Мама, ты суп саліла?

— Ды не... Салі ўжо сама, а то зноўку ўдзвюх пасолім, — адказала тая, і абедзве яны засмяяліся.

Так што лішак солі і праўду шкодны, але ж не заўжды.

**Іван КУРСЕВІЧ,**
*в. Суботнікі, Іўеўскі раён.*

## ВЫЙСЦІ ЗАМУЖ ТРЭБА ЗНАЦЬ...

«З мілым рай і ў будане», — кажуць так досыць часта і многія дзяўчаты, жанчыны... Кажуць, аж пакуль не пабачаць тое жытло, пакуль не паспрабуюць пажыць.

Мой сусед Мікола ў школе быў ледзь не першым гультаём і неслухам. «Мусіць, не будзе з яго чалавека», — уздыхалі часам вяскоўцы. Але ж, як высветлілася, моцна памыліліся, бо пасля службы на флоце хлопца нібы падмянілі, ён, што называецца, узяўся за розум, прычым літаральна: самастойна адолеў і матэматыку, і замежную мову, змог паступіць у ваенна-марское вучылішча імя Фрунзэ, паспяхова скончыць яго...

Там жа, у горадзе на Няве, заваяваў ён сэрца тамтэйшай прыгажуні, згуляў вяселле. Праўда, вузкім колам, без сваіх бацькоў, бо яны ў тую паўночную сталіцу неяк не выбраліся. «Не пусціла», відаць, спрадвечная сялянская занятасць ды сарамлівасць. А яшчэ — надзея, што нявестка на іх не пакрыўдзіцца, прыедзе сюды, у вёску — тут і пазнаёмяцца.

І вось той доўгачаканы прыезд. Маладзіца, апынуўшыся ў вёсцы, ва ўсе вочы глядзіць на пыльную (каравул, без асфальту!) вуліцу, на драўляныя хаты з комінамі, на коней ды курэй на сметніку... Усё для яе незнаёмае, усё, як у кіно, прычым вельмі... дрэнным.

А трэба ж і ў хату зайсці, за сталом пасядзець, нечым пачаставацца. Трэба пасля гэтага, як належыць нявестцы, посуд памыць.

Гарачая вада, ёй сказалі, — у печы.

Ад аднаго толькі выгляду яе (так званай рускай, вялізнай...) маладзіцу апанаваў страх. З цяжкасцю бедная саўладала з засланкай. Жахнулася ад памераў чыгуна, які трэба было неяк выцягнуць, разгубілася, гледзячы ў качарэжнік, дзе стаялі розныя вілкі, качарга, чапяла...

І падбадзёрвалі яе новыя сваякі, і дапамагалі, а ўсё роўна... не дагадзілі: дасталося потым Міколу і за тую печ, і за прыбіральню ў двары ў выглядзе шпакоўні, і за ложак у агульным пакоі, дзе ім давялося ночыць... Завяршыўся ж гэты нявестчын маналог кароткай высновай: «Нагі маёй тут болей не будзе!»

...З-за гэтага ці не, але ж сумеснае жыццё іх пайшло наперакос і неўзабаве скончылася: Мікола і тая сталічная «фіфа» разышліся, як у моры караблі.

І адзін год пасля расстання прайшоў, і другі — ніхто не сустракае капітана, ужо бывалага марскога воўка, з далёкіх паходаў. Маці ды сёстры хвалююцца, перажываюць...

А ж нарэшце навіна: едзе Мікола ў госці! І не адзін — з нявестай, дачкой... генерала!

Ад гэтага, апошняга, у маці і рукі апусціліся. Ну яшчэ б... Калі той, першай сынавай абранніцы, проста гараджанцы, тут не спадабалася, то што ўжо казаць пра гэту, генеральскую дачушку...

А «гэта», між тым, нічому не здзівілася. Павіталася ды параздавала падарункі радні, крутанулася да студні, сама дастала вады, весела паплёскалася ля рукамыйніка. Затым напрасілася паглядзець бы пакарміць трусоў і качак, накапала бульбы...

— Нейкая ж ты, дачушка, дужа свойская, нібы наша, вясковая, — з замілаваннем гледзячы на яе, прызнала свякроўка. — Мусіць, ты пажартавала, мусіць, няпраўда, што твой татка генерал?

— Праўда... Але ж ён, пакуль даслужыўся да гэтага звання, па гарнізонах паездзіў. А мы з мамай — за ім. Дзе толькі ні жылі... Так што я ўсяму навучылася, да ўсяго прывыкла...

А значыць, пашчасціла капітану першага рангу: хоць з другой спробы, але ж знайшоў ён спадарожніцу жыцця, згодную стварыць рай... Нават у шалашы... Абы для каханага!

**Таццяна РАМАНАВА,**
*г. Наваполацк.*

## ПЯЦЬ ЛЫЖАК... ІКРЫ

Даўно было... «Наш тата толькі шкла не ўмее рабіць», — пасля доўгіх назіранняў прызнаў мой брат.

І тым самым — як для дзіцяці — дык досыць мудрую выснову зрабіў, бо тата наш (светлай памяці!) і сапраўды быў на ўсе рукі майстар: і шавец, і бондар, і цясляр, і сталяр... Да таго ж, што важна, — харошы. Не дзіва, што многа заказчыкаў меў — і ў ваколіцах, і ў горадзе, і сярод простага люду, і сярод начальства.

Двое, напрыклад, дзядзька Валодзя і дзядзька Вася (малыя мы іх так называлі), у Рагачове жылі. Тата ім хаты зрубіў, абсталяваў. Працы, ну вядома ж, не на тыдзень меў і нават не на месяц. А таму не дзіва, што пасябраваў ён з заказчыкамі. Ды так, што і праз гады яны дарогу да нас помнілі. Абодва (а ўжо ж розныя... Адзін — з простых вясковых хлопцаў, другі — што па адзенні, што па гутарцы — чалавек з прэзідыума) часцяком заязджалі, прывозілі розныя гасцінцы. Якія? Перафразуючы вядомы выраз: дзецям — цукеркі, бацьку — бутэльку. Бо любілі яны пасядзець...

Дык вось нейкага дня тыя дзядзькі-начальнікі заходзяць у хату. Рукаюцца з татам, тое, што прывезлі, раздаюць. Потым ставяць на стол гарэлку, паўлітровік паюснай ікры, побач кладуць батон. Мама таксама нешта з кухні прыносіць. Мужчыны рассаджваюцца за сталом, наліваюць у чаркі. Дзядзька Валодзя адразу ж бярэцца рабіць бутэрброды: намазвае на батон масла, лыжачкай накладвае ікру, падае нам, малым. Мы, вядома ж, у рот і...

Не, не сказаць, каб дужа скрывіліся, але ж...

— Што, — смяецца дзядзька Валодзя, — не спадабалася? Вам цукеркі смачней?

«Ну яшчэ б!.. Знайшоў пра што пытаца», — моўчкі пераглядваемся мы.

— А мне дык ікра да смаку прыйшлася, — прызнаецца госць, — прычым з першага ж разу!

Ну і далей узгадвае, як прызначылі яго на пасаду, як у хуткім часе трапіў ён на банкет, дзе ўсё раённае начальства за адным сталом сабралася. Напіткаў, расказвае, было — якіх хочаш, на выбар!.. Ну і закуска адпаведная. Дырэктар гандлёвай базы дзеля такой кампаніі нават слоічак ікры «падагнаў», частуе:

— А я ж хлопец з вёскі... Там падобных прысмакаў зроду не было: іх не тое, што не елі, нават у вочы не бачылі. Таму я і цяпер не гляджу — нечым іншым прыкусваю, смяецца дзядзька. — Бачу, дырэктар базы гэта не па нутру. Яшчэ б — ён стараўся, дэфіцыт дабываў, а тут нехта не каштуе — носам круціць ці што?

Каб высветліць гэта, бярэ ён лустачку батона, намазвае маслам, накладвае ікры, падае: на, маўляў, паспытай.

А заадно і той слоічак крыху бліжэй падстаўляе...

Як кажа цяпер сатырык Задорнаў — дарэмна ён гэта зрабіў, бо ёсць прадукты, якіх не хочацца, пакуль не пакаштуеш. А ўжо калі прылажышся, спыніцца амаль немагчыма.

Вось і дзядзька Валодзя. З'еў ён той бутэрбродзік, рассмакаваў — захацеў яшчэ адзін. Зрабіў сабе сам, з'еў. А тут якраз чарговы тост. І чарговая чарка, — прыкусваць трэба. Дык ён той слоічак пад сябе, лыжку ў рукі і наперад: адзін раз зачарпнуў — не шкадуючы, з верхам і напрасткі ў рот, потым — другі, трэці...

Дырэктару базы ад гэтага відовішча аж млосна стала (у памяці, відаць, «Пяць лыжак заціркі» ўсплылі?). Ён давай прапаноўваць Валодзю штосьці іншае з закусак, а слоічак хацеў забраць... Дзядзька не аддаў. Тады дырэктар батон яму суне: на, маўляў, намазвай... «А навошта? — пытаецца Валодзя, — яно і без батона добра».

Так і «ўмяў» гэты дэфіцыт — можна сказаць, адзін...

Больш за тое — свой «подзвіг» хацеў паўтарыць: спытаў у дырэктара базы, калі гэты прадукт паступіць у продаж? Той адказаў, што цяпер не хутка... На жаль...

Прыйшлося дзядзьку апытаць ікру недзе ў Жлобіне. Заадно даведаўся кошт... І, як той казаў, тут жа зразумеў, чаму ікра «не паступае» ў Рагачоў...

Адзінае: у адрозненне ад таго дырэктара, дзядзька Валодзя наконт грошай не такі скупы быў: любіў некага пачаставаць, пасядзець у добрай кампаніі...

І наогул абодва дзядзькі — і Валодзя, і Вася — людзьмі былі шчырымі, простымі. Іх паважалі.

А ў нашых, дзіцячых вачах і наогул з іх прыездам звязаны ці не найлепшыя ўспаміны з маленства.

**Соф'я КУСЯНКОВА,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

■ На заметку

# РАТАВАННЕ АД... ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЙ

**Высокія навуковыя тэхналогіі ўжо трывала ўвайшлі ў паўсядзённае жыццё чалавека, дапамагаюць вырашаць рознага кшталту задачы і палягчаюць жыццё. Але... менавіта яны робяць нас гультаяватымі і абыякавымі! Часта замест таго, каб зрабіць што-небудзь патрэбнае або карыснае для сябе асабіста або грамадства ўвогуле, мы строім дурня з планшэтамі або смартфонамі. А тое і шкодзім сабе! Увогуле ў сучасным грамадстве ў бытавым асяроддзі ўжо паўстала сур'ёзная неабходнасць у эфектыўных жыццёвых прыёмах для таго, каб не стаць рабом тэхналогій, а прымусіць іх працаваць на сябе. Выкарыстанне гаджэтаў дома, на што можна замяніць музыку і як прымусіць смартфон не адцягваць вашу ўвагу — у нашых парадах.**

## ПРЫБЯРЫЦЕ З ЛОЖКА

Многія СМІ ўжо пісалі пра тое, што гаджэты перашкаджаюць інтымнаму жыццю. Бо захапленне смартфонамі, планшэтамі і іншымі прыладамі шкодзіць сямейным і любоўным адносінам. Занадта моцная прага да тэлефонаў, з якімі многія не могуць развітацца нават у ложку, пазбаўляе задавальнення ад рамантыкі, ды і інтымнае жыццё пакутуе, калі не сказаць горш. Партнёры ўсё менш звяртаюць увагу адзін на аднаго, аддаючы перавагу «жыццю» ў сацыяльных сетках. А гэта прыводзіць да падманаў, расстанняў і разводаў. Акрамя таго, шкодна выкарыстоўваць перад сном iPad або любы іншы планшэт. Збіваецца біялагічны гадзіннік, парушаецца сон, а святло ад экрана перашкаджае выпрацоўцы мелатаніну. У офісных работнікаў, хутчэй за ўсё, увесь дзень і так праходзіць за камп'ютарам, а па дарозе на працу зараз і яны і многія іншыя людзі, асабліва моладзь, увесь час «сядзяць» у смартфонах. Так што лепш хоць перад сном пакінуць гаджэт у спакоі і даць вачам у прыватнасці і арганізму ўвогуле адпачыць ад лішняй інфармацыі.

## КІНЬЦЕ «ВУШЫ»

Яшчэ адзін спосаб не стаць рабом тэхналогій — пакінуць дома навушнікі, не браць іх у паездкі. Галава, замест музыкі, якая ўвесь час гучыць у ёй, будзе занятая думкамі (не выключана, што разумнымі), а тыя, хто ўжо даўно не адмаўляецца ад слухавак, са здзіўленнем даведаюцца, што навакольны свет складаецца з мноства іншых гукаў. Дарэчы, у мінскім метрапалітэне з канца мінулага года ўжо дзейнічае забарона на выкарыстанне навушнікаў на платформе. Што цалкам лагічна, між іншым, а то ўжо былі выпадкі, калі «глушцы» не чулі аб'яў дыктараў і з'язджалі не туды, куды трэба. А потым скардзіліся.



## ВЫЗВАЛІЦЕ РУКІ

З тых часоў, як у інтэрнэт мы можам выйсці не толькі з дапамогай камп'ютара, сусветную сетку людзі «цягаюць з сабой» па ўсёй кватэры. Што набліжае нас да зомбі. Паглядзець стужку сацсетак за вячэрай, напісаць сябру паведамленне з ваннай або захапіць з сабой планшэт у прыбіральню — мы не заўважаем ужо, што часцяком не можам зусім адвязацца ад мабільных прылад. Кіньце! Хай тэхніка ляжыць на працоўным стале і не рухаецца па кватэры! Гэта дапаможа мець зносіны з блізкімі, якія і так вас не бачылі цэлы дзень, і зберагчы сябе ад паведамленняў, навін і апавяшчэнняў. Дарэчы, выкарыстанне тэхнікі ў ваннай наогул небяспечна, бо вада плюс электрычнасць — прамая пагроза для жыцця! Зусім нядаўна многія СМІ пісалі пра смяротнае сэлфі, якое рабіла дзяўчына з Масквы ў ваннай, перш чым выпусціць свой iPad у ваду, што ў выніку ўдарыў яе токам. Усё скончылася трагедыяй, і такіх выпадкаў з кожным днём становіцца ўсё больш і больш.

## ПАСЛУХАЙЦЕ... КНІГУ

Калі вы не можаце адмовіць сабе ў задавальненні слухаць што-небудзь у дарозе ці дома, ёсць яшчэ адзін спосаб прымусіць гаджэты прыносіць карысць. Варта замяніць музыку на аўдыёкнігі і падкасты (аўдыёфайл, падобны на радыё, які можна спампаваць з інтэрнэту і паслухаць на камп'ютары ці гаджэце). Вы зможаце вельмі хутка «праглынуць» кнігу, да якой даўно «не даходзілі рукі» і паслухаць нешта карыснае. Улічваючы, як шмат часу мы праводзім у дарозе, аўдыёкнігу можна праслухаць менш чым за тыдзень. А сярод падкастаў шмат цікавых перадач на любыя тэмы.



## АДКЛЮЧЫЦЕ АПАВЯШЧЭННІ

Гэтая парада апошняя, але яе можна (а часам і трэба!) выкарыстоўваць у першую чаргу. Каб не быць закладнікам апавяшчэнняў тэлефона, варта проста іх адключыць. Можна пакінуць толькі выклікі і SMS. Ніякіх апавяшчэнняў ад гульняў, ад дадаткаў, тым больш з сацыяльных сетак, якія хтосьці вам напісаў, або паставіў «лайк». З'явіцца больш вольнага часу — не трэба раз-пораз глядзець на экран смартфона, захавается зарад батарэі, таму што экран — самая «пражэрлівая» частка смартфона — будзе выключаны.

***Можна прапанаваць і больш радыкальныя метады. Выдаліцца з усіх сацыяльных сетак, выкарыстоўваць простую «тэлефанавалку» замест смартфона, адмовіцца ад камп'ютара на карысць, да прыкладу, радыё. Але карысці ад такой «дыеты» можа быць значна менш, чым раздражнення ад таго, што вы нешта ўпускаеце. Каб не станавіцца рабом тэхналогій, трэба проста выкарыстоўваць іх толькі тады, калі гэта сапраўды вам неабходна.***

■ Дайджэст

## НАВУКОЎЦЫ НА ШЛЯХУ ДА НЕЎМІРУЧАСЦІ



**Сенсацыйная навіна прыйшла ад групы навукоўцаў Стэнфардскага ўніверсітэта. Даследчыкам удалося выявіць цалкам бяспечны спосаб падаўжэння жыцця чалавека.**

Працягласць чалавечага жыцця залежыць ад даўжыні целамеры (гэта свайго роду ахоўных «каўпачкі» на канцах храмасом). Яны аберагаюць ДНК ад розных пашкоджанняў. Калі клетка дзеліцца, целамеры ўкарочваюцца, што ў выніку прыводзіць да старэння і смерці. Даследчыкі па ўсім свеце доўгія гады шукалі спосаб, як можна падоўжыць гэтыя ўчасткі ДНК на канцах храмасом, і нарэшце знайшлі. Спецыялісты Стэнфардскага ўніверсітэта змаглі зрабіць гэта з дапамогай медыцынскага ўмяшання. Навукоўцы мадыфікавалі РНК, за кошт чаго былі падоўжаны тыя самыя «каўпачкі». Такім чынам, экспертам удалося павялічыць працягласць жыцця клеткі ў тры разы. А клеткі, якія знаходзіліся ў кантрольнай групе, хутка састарэлі і загінулі.

Навукоўцы адзначаюць, што целамеры маладога чалавека маюць даўжыню прыкладна восем-дзесяць тысяч нуклеатыдаў, а новая тэхналогія дазваляе падоўжыць іх на адну тысячу нуклеатыдаў, што фактычна дае магчымасць павярнуць час назад. «Увядзенне мадыфікаванай РНК, якая нясе ў сабе ген зваротнай целамеразнай транскрыптазы (TERT), у культуру чалавечых клетак нашмат павялічвае актыўнасць целамеразы на перыяд ад аднаго да двух дзён. У гэты тэрмін целамераза актыўна падаўжае целамеры, пасля чаго запраграмаваная РНК цалкам раскладаецца», — распавяла адзін з аўтараў даследавання, прафесар мікрабіялогіі і імуналогіі Стэнфарда Хэлен Блау.

Ранейшыя эксперыменты такога роду сканчаліся няўдала. Уздзейнічаючы на целамеры клетак, навукоўцы атрымлівалі ракавыя клеткі. Але цяпер, на іх думку, новая тэхналогія не толькі падорыць вечнае жыццё людзям, але і вылечыць іх ад многіх генетычных захворванняў.

## НАДВОР'Е СЛУЖЫЛА ВАЙНЕ

**Амерыканскі вучоны расказаў пра эксперыменты ЦРУ з кліматам для вядзення вайны. Пры гэтым упраўленне разведкай таксама цікавіцца падобнымі эксперыментамі ў іншых краінах.**

Алан Робак распавёў пра званок прадстаўнікоў ЦРУ, якія цікавіліся, ці змогуць спецыялісты вызначыць, ці ўплываюць прадстаўнікі іншых краін на надвор'е ў ваенных мэтах. Вучоныя адказаў сцвярджальна і дадаў, што ЗША займаюцца гэтым ужо даўно. Паводле слоў прафесара Ратгерскага ўніверсітэта Алана Робака, прадстаўнікі ЦРУ спрабавалі высветліць, ці могуць іншыя краіны маніпуляваць надвор'ем. Любыя спробы паўплываць на надвор'е ў сусветным маштабе не застануцца незаўважанымі, адказаў прадстаўнікам ЦРУ навуковец.



Пры гэтым Робак сцвярджае, што гэтым не раз займаліся самі ЗША. У якасці прыкладу ён прыводзіць вайну ў В'етнаме. Тады амерыканцы абрынулі на ворага ліўневыя дажджы, каб спыніць наступленне салдат праціўніка. Такі ж уплыў на клімат амерыканцы аказвалі таксама і на Кубе, і ёсць меркаванне, што вынікам яго стала знішчэнне ўсяго ўраджаю цукровага трыснягу.

Робак заявіў, што не падтрымлівае правядзенне падобных эксперыментаў і не хацеў бы, каб гэты напрамак фінансаваўся з падаткаў. «На мой погляд, даследаванні ў галіне клімату павінны быць адкрытымі і міжнароднымі, каб ніхто не мог выкарыстаць іх у ваенных мэтах», — заявіў прафесар і дадаў, што правядзенне такіх распрацовак можа прывесці да поўнамаштабнай вайны.

## СПРАВА ПРАФЕСАРА ДОУЭЛЯ

**Італьянскі нейрахірург Серджыа Канавера распрацаваў пакрокавую тэхніку трансплантацыі чалавечай галавы і мае намер ажыццявіць першую ў свеце аперацыю падобнага роду. Даўняя ідэя падаўжэння чалавечага жыцця, якую часта апісвалі фантасты, як, напрыклад, Аляксандр Бляеў у сваім рамане «Галава прафесара Доуэля», сёння набывае практычныя абрысы.**



Паводле задумы Серджыа, донар і рэцыпіент апускаюцца ў стан штучнай комы, іх целы астуджаюцца да 18 °C, а затым галовы адлучаюцца ад целаў з дапамогай скальпеля. Спінны мозг галавы донара і тулава рэцыпіента, якія знаходзяцца ў ствалавой абалонцы, склейваюцца з дапамогай спецыяльна распрацаванага клею на аснове глікапратэіну, а крывяносныя сасуды «спайваюць» па адпрацаваных методыках.

Спінны мозг, апрацаваны поліэтыленгліколем, павінен паступова аднаўляць свае жыццёвыя функцыі, што пацвердзілі вынікі эксперыментальных аперацый, праведзеных на пацуках у Дзюсельдорфскім універсітэце ў Германіі. Пасля завяршэння аперацыі рэцыпіента з донарскай галавой пакідаюць у коме на тэрмін каля месяца з электродамі, імплантаванымі ў пазваночны канал, неабходнымі для забеспячэння электрастымуляцыі спіннога мозга, патрэбнай для стварэння новых нервовых сувязяў.

Паводле сцвярджэння нейрахірурга, аперацыя прынясе беспрэцэдэнтныя вынікі — чалавек з імплантаванай галавой зможа паўнавартасна рухаць тварам і размаўляць. Ажыццявіць першы вопыт трансплантацыі Канавера плануе на працягу наступных двух гадоў, прычым некалькі чалавек ужо выказалі жаданне стаць добраахвотнікамі.

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Брестоблресурсы» (продавец)**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**ПО ПРОДАЖЕ ГАРАЖА**

**инвентарный номер 122/С-12453, общей площадью 240,6 кв.м; забора металлического (инв. № по бухучету 00001047) протяженностью 104,3 м.п., расположенных по адресу: Брестская область, г. Ивацевичи, ул. Загородная, д. 4.**

**Начальная цена лота с НДС (20%) – 488 212 800 бел. руб.**

Объекты недвижимости расположены на земельном участке пл. **0,2613 га**, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания гаража с установленными ограничениями: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий электропередачи, площадь 0.0282 га.

**Задаток 10% от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Условия оплаты за объект: оплата осуществляется в соответствии с заключенным договором купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и возмещения суммы фактических затрат за организацию и проведение аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Оплата вознаграждения за организацию и проведение торгов, а также суммы фактических затрат на его проведение осуществляется победителем торгов (покупателем), в порядке предусмотренным соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

| | |
|---|---|
| **Дата, время и место проведения аукциона:** | **17.04.2015 г. в 12.30** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 4, ГО «Белресурсы» – управляющая компания холдинга «Белресурсы», 3-ий этаж, актовый зал. |
| **Срок окончания приема документов для участия в аукционе:** | Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.04.2015 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». |

**Тел.: +375 17-280-36-37; 8029-183-69-71.**
**www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

# РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже**

## незавершенного незаконсервированного капитального строения производственного корпуса «Комплект 1-ЭГ»,

**расположенного по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 121А/48 и принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ» (Продавец).**

Земельный участок площадью 25,9447 га с кадастровым номером 500000000004002234. Целевое назначение – эксплуатация и обслуживание административных и производственных зданий и сооружений. Право постоянного пользования. Описание права, ограничения (обременения) прав: охранная зона магистральных трубопроводов, площадь 0,0638 га, 0,1819 га, 0,0120 га, 0,0475 га, 0,0070 га; охранная зона водопровода, площадь 0,0189 га, 0,0150 га; охранная зона линий связи, площадь 0,0024 га; 0.0024 га; 0,0022 га; 0,0026 га; охранная зона электрокабеля, площадь 0,0040 га. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион.

Для обслуживания выставленного на аукционные торги Объекта предполагается передать Победителю аукциона (Претенденту на покупку) условно сформированный земельный участок площадью 1,1916 га и предоставить ограниченное право пользования земельным участком площадью 0,5602 га (земельный сервитут). Решение о выделении земельного участка будет приниматься в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь после определения Победителя аукциона (Претендента на покупку).

**Начальная цена с НДС – 13 384 740 000 бел. руб. Задаток с НДС – 1 000 000 000 бел. руб.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ»,* **проводимом 27 марта 2015 г.**

Договор купли-продажи Объекта должен быть заключен в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи Объекта. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона в размере 1% (одного процента) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Обязанность по оформлению всех документов, связанных с регистрацией сделки купли-продажи Объекта, оформлению прав собственности на Объект и выделению земельного участка возлагается на Победителя аукциона (Претендента на покупку). На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Аукцион состоится **27.03.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 25.03.2015 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 2.

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 09.10.2014.*
С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Дополнительная информация: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

## извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего государственному предприятию «ЦЕНТРКУРОРТ» на праве хозяйственного ведения

| Лот | Объект | Местонахождение | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток с НДС, руб. | Шаг аукциона |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | Автобус VANHOOL 927 номер рамы YF2927SD366M25819 | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, 54/35 | 1 327 974 000 | 20 000 000 | 5 |

Г.в. – 2000. Мест – 87. Цвет – белый. Пробег по одометру на 12.01.2015 – 1 305 767 км. Двигатель – дизельный, турбонадув, 12 816 см³ . КП – механическая. Шины, диски – всесезонные. Оборудование – серийное; два монитора.

| Лот | Объект | Местонахождение | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток с НДС, руб. | Шаг аукциона |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот №2 | Автобус SETRA S228 номер рамы WKK13900001030775 | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, 54/35 | 327 588 000 | 5 000 000 | 5 |

Г.в. – 1992. Мест – 77. Цвет – белый. Пробег по одометру на 12.01.2015 – 239 484 км. Двигатель – дизель, турбонадув, 12 816 см³. КП – автоматическая. Оборудование – серийное; два монитора.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) не позднее 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) не позднее 20 (двадцати) банковских дней с даты заключения договора купли-продажи Объекта (Объектов).
Передача Объекта (Объектов) производится только после полной оплаты не позднее 30 (тридцати) календарных дней с даты оплаты.
Сумма внесенного Победителем аукциона (Претендентом на покупку) задатка (задатков) учитывается при оплате Объекта (Объектов).
При оплате наличными денежными средствами Победитель аукциона (Претендент на покупку) возмещает Продавцу расходы, связанные с инкассацией наличных денежных средств.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Информация о затратах доводится до сведения участников до начала проведения аукциона по каждому Объекту, выставляемому на аукцион.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

